ПРОЛЕТАРИИ ВСЕХ СТРАН, СОЕДИНЯЙТЕСЬ! PROLETARJUSZE WSZYSTKICH KRAJÓW, ŁĄCZCIE SIĘ!

адрэс РЭДАКЦЫІ і КАНТОРЫ
Менск, Пляц Волі № 17,
1-шы паверх
ТЭЛ. Сакратара—№ 478, Рэдактара—№ 765, Канторы—№ 244, Сэктара прамысловасьці—№ 615

XI ГОД ВЫДАНЬНЯ ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

№ 23 (3112)
ЧАЦЬВЕР 29 СТУДЗЕНЯ 1931 ГОДУ

КОШТ НУМАРУ 5 КАП.
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:
На 1 месяц . — 90 к.
„ 3 „ . 2 р. 70 к.
„ 6 „ . 4 р. — к.
„ 1 год . 8 р. — к.

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў і Савету Народных Камісараў Б. С. С. Р.

У-б. "Савецкая Беларусь" Москва, Моховая, 8 Публичной библиотека СССР им. Ленина отд. обмен. адвін экз.

МАБІЛІЗУЕМ рабочыя, калгасныя і бядняцка-серадняцкія МАСЫ

на рашучае выкананьне пастаноў студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б

Менскі партактыў даў жорсткі ўдар вылазцы апартуніста Смаля

БССР, як неадлучная частка ўсяго Савецкага Саюзу, дамаглася значных посьпехаў на фронце гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Посьпехі ў галіне сацыялістычнай індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, у палепшаньні матар'яльнага і культурнага дабрабыту рабочае клясы і працоўных мас сялянства, ліквідацыя беспрацоўя—ўсё гэта яшчэ больш узьнімае рэвалюцыйны энтузіязм рабочых і працоўных мас, якія пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, змагаюцца за выкананьне вялізарнейшай праграмы трэцяга рашаючага году, змагаюцца за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады.

Дасягнутыя намі посьпехі за два гады пяцігодкі і ўдарнага кварталу стварылі магчымасьць для яшчэ больш шырокага разгортваньня сацыялістычнага наступу па ўсім фронце ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі. Студзеньскі пленум ЦК КП(б)Б, які канкрэтызаваў на ўмовах БССР дырэктывы аб'яднанага сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб забясьпечаньні выкананьня пяцігодкі ў 4 гады і завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў нашай краіне, мае вялізарнае значэньне.

Намечаны ім рост валавой прадукцыі прамысловасьці ў трэцім рашаючым годзе на 434 міл. руб., капітальных укладаньняў у агрэмаджаны сэктар у суме 320 млн. рублёў, забясьпечаньне шпэрхіх тэмпаў разьвіцьця цяжкай прамысловасьці—гэта гаворыць аб тым, што БССР пры братэрскай дапамозе ўсяго Савецкага Саюзу, забясьпечвае значны новы ўзрост сацыялістычнай прамысловасьці, як кіруючага пачатку ўсёй народнай гаспадаркі, забясьпечвае паскораныя тэмпы індустрыялізацыі і калектывізацыі ў 1931 годзе 45 проц. сялянскіх дваро́ў БССР.

Праграма трэцяга году пяцігодкі зусім рэальная праграма. Яна будзе выкананая і перавыкананая пры ўмове рашучага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, оязьлітаснай барацьбы супроць апартунізму ўсякага колеру, пры ўмове далейшага разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва, пры ўмове далейшага ўздыму працоўчага энтузіязму рабочае клясы і шырокіх калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі.

Сход партактыву Менскай гарпэтдэпартаменту, як быў прысьвечаны выхадам студзеньскага пленуму КП(б)Б цалкам далучыўся да пастаноў пленуму.

Выступаўшыя цалкам далучаліся да пастановы ЦКК КП(б)Б, аб выключэньні з партыі здрадніка-правага нацыянал-апартуністаў—Ігнатоўскага і Жылуновіча. Выступаўшыя адзначылі, што КП(б)Б, пад кіраўніцтвам свайго ЦК, дасягнула вялізарных посьпехаў на фронце ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Партыя, пад кіраўніцтвам свайго ЦК, выкрыла нацыянал-апартуністаў іх дробна-буржуазныя тэорыі і яшчэ больш узмацніла сваю бальшавіцкую пільнасьць, яшчэ больш згуртавала свае рады для пасьпяховага змаганьня за выкананьне плянаў трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Т. т. Шпэктараў, Пятушкоў і Аксючыц сраз выступленьні прысьвяцілі пытаньням калектывізацыі, падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі, пытаньням будаўніцтва і работы гарадзкога савету.

Тав. Агульнік, паказаўшы на вялізарныя задачы, якія пастаўлены студзеньскім пленумам ЦК КП(б)Б перад усёй КП(б)Б і рабочай клясай, падрабязна спыняецца на пытаньнях работы саветаў і ў прыватнасьці на рабоце Менскага гарсавету. Тав. Агульнік расцэньвае выступленьне Аксючыца па пытаньні работы гарадзкога савету яўна нездавальняючым. «Тав. Аксючыц—кажа т. Агульнік—ня выкрыў і не раскрытыкаваў апартуністычных скажэньняў, якія былі дапушчаны гарсаветам у радзе пытаньняў і якія знайшлі адбітак у «славутай» справаздачы».

З права-«лявацкай», паклепніцкай прамовай выступіў у спрэчках тав. Смаль, які імкнуўся даказаць, што ў КП(б)Б не разгорнута самакрытыка, што крытыкаваць можна толькі низавых работнікаў, абвінавачваў партыю па радзе другіх пытаньняў.

Гаворачы аб рабочым забесьпячэньні, Смаль меў наглясьць сьцьвярджаць, што ў сувязі з адабраньнем агародаў ад абываталяў у Менску і ў іншых гарадох БССР рабочыя засталіся без гародніны. У гэтым сьцьвярджэньні выразна выяўляецца жаданьне Смаля абараніць кулацкія элемэнты. Гэта выступленьне было накіравана супроць калектывізацыі, супроць плянавага забесьпячэньня пралетарскіх цэнтраў гародніной.

Смаль, гаворачы аб труднасьцях, ні слова не сказаў аб тым, што нашы труднасьці зьвязаны з ростам сацыялізму, з жорсткім клясавым змаганьнем. Смаль знаходзіць, што ні дакладчык, ні другія прамоўцы «не далі аналізу, а толькі канстатуюць, што ў нас труднасьці, а канкрэтна не паказваюць, што трэба зрабіць, каб гэтага ня было». Смаль у завуаляванай форме прабаваў абвінаваціць партыю і яе ЦК у тым, што партыя ня прымае ніякіх закадаў, каб выйсьці з труднасьцяй, каб іх перамагчы. Пад такім сьцьвярджэньнем з вялікай ахвотай могуць падпісацца апартуністы ўсіх колераў разам з клясавым ворагам—кулаком.

Далей Смаль прабаваў абвінаваціць КП(б)Б, што быццам яна няжорстка і нерашуча змагаецца са шкоднікамі. Смаль быццам-бы не разумее, што да тых часоў, пакуль у нашай краіне ёсьць клясавы вораг, ёсьць кулацкія элемэнты, якія ўсяляк імкнуцца перашкаджаць сацыялістычнаму будаўніцтву, шкодніцтва можа мець месца як у прамысловасьці, так і ў сельскай гаспадарцы. Смаль ні ў горадзе, ні ў вёсцы ня бачыць клясавага змаганьня, ня бачыць шалёнага супраціўленьня клясавага ворага сацыялістычнаму наступленьню, а таму прыходзіць да выводу, што партыя невыстарчальна змагалася са шкоднікамі. Такое сьцьвярджэньне зьяўляецца тыповым выступленьнем заядлага апартуніста.

Смаль недапушчальна і беспадстаўна абвінавачваў ЦК у заціску самакрытыкі. Смаль тут-жа паўтараў старыя трацкісцкія матывы аб немагчымасьці крытыкаваць. Партактыў даў самы жорсткі адпор гэтаму выступленьню. Прамова Смаля дзесяткі раз перапынялася бурнымі пратэстамі, перапыненьнямі актыву пазбавіць слова кулацкага агента.

Спыняючыся на выступленьні Смаля, прамоўцы падкрэсьлівалі, што гэта выступленьне зьяўляецца антыпартыйным, права-«лявацкім» выступленьнем, накіраваным супроць ЦК КП(б)Б і ўсяе КП(б)Б.

У заключным слове тав. Шаранговіч падрабязна спыніўся на рабоце КП(б)Б па калектывізацыі, на далейшай задачы ў сувязі з пастановамі студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б. Тав. Шаранговіч даў рашучы адпор права-«лявацкаму» наскоку Смаля на лінію КП(б)Б і на яе ЦК.

Сход партыйнага актыву прыняў рэзалюцыю, у якой цалкам далучаецца да бальшавіцкіх пастаноў студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б, вызначыў рад чарговых задач Менскай гарадзкой партарганізацыі і асудзіў антыпартыйнае выступленьне Смаля.

Рыхтуем рапарт мільёнаў зьездам саветаў.

Рапартаваць Зьезду Саветаў

перавыкананьнем прамфінпляну, узьняцьцем якасьці прадукцыі, ударнай падрыхтоўкай да другой бальшавіцкай вясны.—У арганізацыю рапарта ўключыліся: ф-ка „Кастрычнік" (Менск) і калгас „Камуніст" (Бабруйск).

Чакаем водгуку рабочых „Палесдруку", друкарні „Зьвяды", заводу „Энэргіі", „Бальшавіка", і „Пралетары", „фабрык „Прафінтэрн", „Камінтэрн" і інш. швэйных фабрык БССР.

Уключаемся ў рапарт мільёнаў

Веснавая сяўба будзе праведзена па-ўдарнаму

(АД НАШАГА КАРЭСПАНДЭНТА).

Калгас «Камуніст» па баявому спрауляецца з усімі задачамі, якія высоўвае перад ім партыя і ўрад. Ён першым у раёне закончыў у мінулую вясну сяўбу, першым закончыў і ўборку ўраджаю. Гэтыя бальшавіцкія тэмпы калгас захаваў і па сёняшні дзень, па ўдарнаму рыхтуючыся да веснавой сяўбы.

У калгасе ўжо закончана ачыстка насеньня. Поўнасьцю створаны насенны фонд. Створаны і страхавы фонд. Шырока абгавораны сярод калгасьнікаў кантрольныя лічбы веснавой пасеўнай кампаніі. Гэтае абгаварэньне прайшло пад знакам высоўваньня свайго сустрэчнага пасеўнага пляну. Калгасьнікі пастанавілі ў парадку сустрэчнага пляну павялічыць плошчу засеву ярыны на 20 гектараў супроць лічбы, дадзенай калгасу раённым цэнтрам.

Калгас даўно ужо пачаў рамонт сельска-гаспадарчага інвэнтару. Бароны ўжо ўсе адрамантаваны. Цяпер рамантуюцца плугі ды іншыя прылады.

Пры абгаварэньні вытворчага пляну калгасу, калгасьнікі паставілі перад сабою баявую задачу: да пачатку сяўбы ўцягнуць у калгас сто новых бядняцка - серадняцкіх гаспадарак. Кантрольныя лічбы веснавой пасеўнай кампаніі шырока абгавораны сярод калгасьнікаў. Калгас высунуў пытаньне аб неабходнасьці ўстанаўленьня строгай вытворчай дысцыпліны і норм працы. Агульным сходам вынесена пастанова, у якой устанаўліваюцца наступныя нормы. Кожны мужчына—член калгасу павінен прапрацаваць на працягу году ня менш 270 рабочых дзён; жанчына—ня менш 180-200 рабочых дзён і падлеткі—ня менш 80-100 рабочых дзён. У сучасны момант вядзецца праца па давядзеньні пэўных момантаў вытворчага пляну да асобных брыгад калгасьнікаў і асобных членаў калгасу. Строгае разьмеркаваньне працы, да якога ідзе калгас дасьць магчымасьць яму яшчэ больш пасьпяхова праводзіць сваю работу, чым гэта было да сучаснага моманту.

Калгас прыступіў да загатоўкі ўгнаеньня да веснавой сяўбы. Цягавая сіла калгасу ўтрымліваецца добра і калгас упэўнены ў тым, што ён пасьпяхова справіцца з задачамі веснавой сяўбы.

Заяўляючы аб сваіх гаспадарчых дасягненьнях калгас «Камуніст» уключаецца ў рапарт мільёнаў да X Усебеларускага зьезду саветаў.

Калгас заяўляе, што вытворчы плян ня толькі будзе выкананы, але і перавыкананы, веснавая сяўба будзе праведзена па-ўдарнаму.

А. ДАМБРОЎСКІ.

Бабруйскі раён.

Лепшых ударнікаў — у гарсавет

Перазьбарчая кампанія гарсавету на Менскім хлебазаводзе праведзена здавальняюча. Асобныя вытворчыя брыгады заключылі паміж сабой дагаворы на сацспаборніцтва па лепшай падрыхтоўцы да перавыбараў. У сацдагаворах паміж гэтымі брыгадамі адзначана: больш упісьці прапаноў да наказу, давесьці наказ да кожнага выбаршчыка, давіць 100-процантный яўкі на справаздачныя і перавыбарчыя сходы.

25-га студзеня на выбарчым сходзе хлебапякарні была 100 проц. яўка.

Кожны праект наказу абмяркоўваецца вельмі ўважліва і вельмі дзелавіта. У наказ унесена шмат прапаноў, якія датычацца раду вытворчых пытаньняў, рабочага забясьпечаньня і дабрабыту гораду.

Сход прайшоў вельмі ажыўлена. Гучнымі воплескамі сход вітае сваіх ударнікаў, якія абіраюцца дэпутатамі ў гарсавет. Дэпутатамі адназгодна абіраюцца: т. т. Кеніг — старшыня Гар. КК КП(б)Б, былы дырэктар заводу, член КП(б)Б з 1904 г.; Грабовец—стары рабочы заводу, прэміраваны ўдарнік, член КП(б)Б; Серая—работніца, лепшая ўдарніца, актывістка, беспартыйная.

Брыг. «Сав. Бел.» Ларычкаў.

Выклік друкароў прымаем

(ф-ка Кастрычнік)

Рабочыя швэйнай чырвонаштандартнай фабрыкі «Кастрычнік» прымаюць выклік рабочых друкарні імя Сталіна аб уключэньні ў арганізацыю «рапарта мільёнаў» X Усебеларускаму зьезду саветаў.

Фабрыка «Кастрычнік» прымае на сябе наступныя абавязкі, аб выкананьні якіх будзе рапартаваць X Усебеларускаму зьезду саветаў праз газэту «Савецкая Беларусь».

1. Ліквідаваць прарыў, які маецца ў выкананьні прамфінпляну за студзень месяц. Ліквідаваць прарыў у 3-ім агрэгаце;
2. Забясьпечыць 100-процантны ўдзел урабочых у перавыбарах гарсавету. Даць гарсавету ў якасьці дэпутатаў лепшых ударнікаў фабрыкі.
3. Да адчыненьня зьезду ВЫКАНАЦЬ 100-ПРОЦАНТНАЕ ЗАДАНЬНЕ САКАВІКА;
4. Палепшыць якасьць прадукцыі, вылучыўшы для гэтага спэцыяльную брыгаду па якасьці і арганізаваўшы масавы кантроль над якасьцю прадукцыі;
5. Уцягнуць новых ударнікаў у брыгады імя X Усебеларускага зьезду;
6. Дабіцца зьмяншэньня прагулаў і спазьненьняў, шляхам жорсткай барацьбы з прагульшчыкамі;
7. Не пазьней 10 лютага скончыць кантрактацыю рабочых за фабрыкай да канца пяцігодкі, ахапіўшы ёй 100 проц. рабочых.
8. Арганізаваць праверку выкананьня рабочых прапаноў;
9. Ахапіць усіх рабочых падпіскай на пазыку «Пяцігодка—ў чатыры гады»;
10. Выканаць кантрольныя лічбы па фабрычнай касе ашчаднасьці і ўцягнуць больш укладчыкаў;
11. Шырока разгарнуць работу да выкананьні прамфінпляну за студзень месяц. Ліквідаваць прарыў у 3-ім агрэгаце;
12. Забясьпечыць 100-процантны ўдзел урабочых у перавыбарах гарсавету. Даць гарсавету ў якасьці дэпутатаў лепшых ударнікаў фабрыкі.
13. Да адчыненьня зьезду ВЫКАНАЦЬ 100-ПРОЦАНТНАЕ ЗАДАНЬНЕ САКАВІКА;
14. Палепшыць якасьць прадукцыі, вылучыўшы для гэтага спэцыяльную брыгаду па якасьці і арганізаваўшы масавы кантроль над якасьцю прадукцыі;
15. Уцягнуць новых ударнікаў у брыгады імя X Усебеларускага зьезду;
16. Дабіцца зьмяншэньня прагулаў і спазьненьняў, шляхам жорсткай барацьбы з прагульшчыкамі;
17. Не пазьней 10 лютага скончыць кантрактацыю рабочых за фабрыкай да канца пяцігодкі, ахапіўшы ёй 100 проц. рабочых.
18. Арганізаваць праверку выкананьня рабочых прапаноў;
19. Ахапіць усіх рабочых падпіскай на пазыку «Пяцігодка—ў чатыры гады»;
20. Выканаць кантрольныя лічбы па фабрычнай касе ашчаднасьці і ўцягнуць больш укладчыкаў;
21. Шырока разгарнуць работу да Усесаюзнай нарады рабселькораў, для чаго склікаць нараду рабкораў фабрыкі і старэйшых брыгадзіраў.

Даручыць цэхкамітэтам, рэдкалегіі шматтыражкі і ільнічоўкі, устанавіць рабкораўскія пасты, якія-б сачылі за выкананьнем узятых на сябе фабрыкай абавязкаў і праз кожны 5 дзён інфармавалі-б ініцыятара рапарту газ. «Савецкая Беларусь» аб ходзе падрыхтоўкі рапарту.

Выклікаем уключыцца ў арганізацыю «рапарта мільёнаў» X Усебеларускаму зьезду саветаў фабрыкі «Прафінтэрн», «Камінтэрн», імя Дзяржынскага і інш. швэйныя фабрыкі БССР.

Арбітрамі па праверцы выкананьня рапарту абіраем газэты «Савецкая Беларусь» і «Акцябр».

Будаўнікі Менбуда ідуць на перавыбарчы сход.

КП(б)Б і яе ЦК ажыцьцяўляюць генэральную лінію партыі

Рэзалюцыя сходу Менскага гарадзкога актыву КП(б)Б па дакладу тав. Шаранговіча аб выніках студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б

Заслухаўшы даклад сакратара ЦК тав. Шаранговіча аб выніках студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б, актыў Менскай гарадзкой партыйнай арганізацыі поўнасьцю ўхваляе і цалкам далучаецца да пастаноў пленуму.

1. Актыў канстатуе вялікія дасягненьні БССР, як неадлучнай часткі ўсяго Савецкага Саюзу, ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва: як у галіне разьвіцьця і росту народнай гаспадаркі, так і ў галіне культурна-нацыянальнай. Посьпехі ў індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскай гаспадаркі, палепшэньне дабрабыту рабочай клясы і асноўных мас сялянства, якія павярнулі на шлях сацыялістычнага разьвіцьця сельскай гаспадаркі, ліквідацыя беспрацоўя прывялі да вялікага росту на аснове гэтых дасягненьняў рэвалюцыйнай актыўнасьці і творчага энтузіязму працоўных, росту давер'я і згуртаванасьці працоўных мас вакол камуністычнай партыі і яе ленінскага ЦК, — непахісная адданасьці справе ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, справе выкананьня пяцігодкі за чатыры гады, справе бальшавіцкіх тэмпаў.

У гэты час сусьветны крызіс капіталістычнай гаспадаркі ўсё больш паглыбляецца, уцягваючы ўсё новыя капіталістычныя краіны у сваю арбіту. Сусьветны крызіс капіталізму знаходзіць найбольш яскравыя адзнакі ў катастрафічным росьце беспрацоўя і галечы рабочае клясы, у масавым зруйнаваньні і зьбяднеьні асноўных сялянскіх мас. Паглыбленьне крызісу капіталістычнай сыстэмы, які ў радзе краін перарастае ў палітычны крызіс, абвастрае кіравыя супярэчнасьці і выклікае рост рэвалюцыйных настрояў сярод працоўных мас капіталістычных краін. Рабочая кляса, пад кіраўніцтвам камуністычных партый, дае жорсткі адпор атакам капіталу, які пробуе ўсю цяжасьць крызісу перакласьці на плечы працоўных, і пераходзіць у контр-наступленьне.

Рабочая кляса капіталістычных краін пад кіраўніцтвам кампартыі рыхтуецца да баявога выступленьня 25-га лютага—у дзень барацьбы з беспрацоўем —супроць капіталістычнай сыстэмы і ўрадаў фашысцкай дыктатуры, тэрору, беспрацоўя, голаду і галечы пад лёзунгам «барацьбы з беспрацоўем, барацьбы за хлеб і работу».

Паглыбляецца капіталістычны крызіс, расьце магутны рэвалюцыйны рух рабочай клясы і працоўных мас, абвастраюцца ўсе супярэчнасьці капіталістычнай сыстэмы, супярэчнасьці паміж капіталістычнымі дзяржынкамі і краінай дыктатуры пралетарыяту. Небясьпека новай імпэрыялістычнай бойкі за новы перадзел сьвету і ў першую чаргу небясьпека нападу капіталістычных дзяржаў на СССР—банькаўшчыну сусьветнага пралетарыяту—і небясьпека ўзброенай інтэрвэнцыі супроць СССР усё абвастраецца. Аб гэтым сьведчаць узрастаючыя шалёныя тэмпы узбраеньня і антысавецкая кампанія, якую, у сувязі з надыходзячай вясной, узьнімаюць капіталістычная дыплёматыя і друк.

Актыў падкрэсьлівае ў сувязі з гэтым усю важнасьць працы ў галіне ўзмацненьня абароназдольнасьці савецкай краіны шляхам далейшага паскарэньня тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, далейшага ўзмацненьня баяздольнасьці рабоча-сялянскай Чырвонай армі, сувязі з рабочай клясай з байцамі Чырвонай армі, далейшага разгортваньня працы АСО.

2. Посьпехі, дасягнутыя ў сацыялістычным будаўніцтве за два гады пяцігодкі і за ўдарны квартал, даюць поўную магчымасьць у трэцім рашаючым годзе яшчэ шырэй разгарнуць сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце. Актыў лічыць, што гаспадарчы плян БССР на трэці год пяцігодкі які вызначан студзеньскім пленумам ЦК КП(б)Б, цалкам адпавядае дырэктывам, дадзеным XVI зьездам і сьнежаньскім пленумам ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб далейшым разгорнутым наступленьні сацыялізму па ўсім фронце, для ажыцьцяўленьня лёзунгу «Пяцігодка—за чатыры гады» і завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі. Намечаны рост валавой прадукцыі прамысловасьці ў трэцім годзе ў суме 434 млн. руб., а капітальных укладаньняў у агрэмаджаны сэктар у суме 320 млн. руб., гаворыць аб тым, што мы разам і пры дапамозе Савецкага Саюзу забясьпечым узрост сацыялістычнай прамысловасьці, як вядучага пачатку ва ўсёй народнай гаспадарцы, і далейшыя посьпехі індустрыялізацыі і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі БССР.

Актыў, канстатуючы вялікі рост вытворчага энтузіязму і рэвалюцыйнай актыўнасьці пралетарскіх, калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас, які знаходзіць сваё выяўленьне ў сацспаборніцтве, ударніцтве і іншых формах сацыялістычнай працы,—падкрэсьлівае, што вялікія пляны трэцяга рашаючага году пяцігодкі будуць выкананы і перавыкананы пры захаваньні і далейшым разгортваньні бальшавіцкіх тэмпаў, пры няўхільнай барацьбе супроць апартуністычнай практыкі супроць хвасьцізму пасобных камуністаў на пралрыемствах, пры ўмове, калі партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі, якія яшчэ далёка ня ўсюды паварочаліся тварам да новых задач, высунутых партыяй, асабліва на транспарце—сапраўды стануць на чале вытворчага энтузіязму працоўных мас.

Актыў з асаблівай сілай падкрэсьлівае неабходнасьць выкананьня дырэктывы ленінскага ЦК УсеКП(б), якая канкрэтызавана ЦК КП(б)Б у прыстасаваньні да ўмоў БССР—аб падняцьці працы транспарту, у першую чаргу чыгунак—транспарту, які зьяўляецца на сёньняшні дзень вузкім месцам, перамаганьне якога ў значнай ступені раашае пытаньне аб выкананьні пяцігодкі за чатыры гады.

Актыў ставіць перад Менскай гарадзкой арганізацыяй задачу, не паслаўляючы барацьбы за колькасныя паказальнікі плянаў, узмацніць барацьбу за якасныя паказальнікі,—за якасьць прадукцыі, бо гэтым у значнай ступені раашецца заданьне далейшага павышэньня рэальнай заработнай платы.

Актыў канстатуе, што посьпехі, дасягнутыя намі на аснове няўхільнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі ў калектывізацыі сельскай гаспадаркі, наяўнасьць вялікага калгаснага ўздыму бядняцка-серадняцкіх мас вёскі даюць нам магчымасьць значна ўзмацніць тэмпы калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Актыў лічыць вызначаныя пленумам тэмпы калектывізацыі сельскай гаспадаркі (45 проц. да канца 1931 г.) цалкам рэальнымі.

На ажыцьцяўленьне гэтых задач павінны быць мабілізаваны ўсе сілы партарганізацыі.

Выкананьне гэтых важнейшых задач патрабуе:

а) Бязьлітаснай упартай барацьбы з права-апартуністычнай стаўкай на самацёк у калгасным руху і з рэцыдывамі «лявацкіх» загібаў.

б) Сыстэматычнай штодзённай работы ўсёй КП(б)Б па арганізацыі новага калгаснага прыліву на аснове ленінскіх прынцыпаў добраахвотнасьці.

в) Сапраўднай бальшавіцкай падрыхтоўкі да другой калгаснай вясны.

г) Мабілізацыі ўвагі мас на пытаньні арганізацыі працы ў калгасах, правільнага разьмеркаваньня прыбыткаў, ураджаю, спэцыялізацыі па асноўных галінах сельскае гаспадаркі БССР.

Актыў заклікае ўсю арганізацыю пралетарскай сталіцы БССР да актыўнага кіруючага ўдзелу ва ўсіх мерапрыемствах, вызначаных пленумам у падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі, да арганізацыі новага калгаснага прыліву.

Актыў даручае гаркому выпрацаваць мерапрыемствы для рашучага ўзмацненьня шэфскай работы менскіх рабочых калектываў.

Магутным вагаром ажыцьцяўленьня задач другой калгаснай вясны зьяўляюцца мерапрыемствы па кантрактацыі сельскай гаспадаркі, вызначаныя ў апублікаванай адозьве СНК СССР і ЦК УсеКП(б).

Поўнае і бязумоўнае выкананьне пятнай кантрактацыі забясьпечыць ажыцьцяўленьне тых задач па сацыялістычнай рэканструкцыі і тэхнічным пераўзбраеньні сельскай гаспадаркі (розьвіцьцё жывёлагадоўлі, тэхнічных культур, спэцыялізацыя сельскай гаспадаркі) якія намечаны пленумам ЦК КП(б)Б.

Актыў лічыць неабходным самую шырокую папулярызацыю адозвы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) аб кантрактацыі і даручае гаркому распрацаваць усе патрэбныя мерапрыемствы для дапамогі ў працы над яе рэалізацыі.

Уся вялізарная праграма сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі будзе ажыцьцяўляцца па ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, ва ўмовах шалёнага супраціўленьня кулака нашаму сацыялістычнаму наступленьню.

Моцна ўдарыць па кулаку, па яго агентах правых і «левых» апартуністах, няўхільна ажыцьцяўляць важнейшы лёзунг партыі аб ліквідацыі кулацтва як класы, на аснове суцэльнае калектывізацыі,—гэта асноўныя ўмовы посьпеху вялізарнай праграмы сацыялістычнага наступленьня, вызначанай пленумам ЦК КП(б)Б.

3. Выкананьне задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі—барацьба за генэральную лінію партыі—патрабуе далейшай самай жорсткай барацьбы на два фронты: супроць правага апартунізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць «левых» загібаў, якія льлюць ваду на млын правых, супроць апартуністычнай практыкі, супроць усялякіх ухілаў ад ленінскай лініі, супроць усялякіх праяў фракцыйнасьці, супроць бяспрынцыпнага права-«лявацкага» блёку Сырцовых-Ламінадзэ і прымірэнчых адносін да ўсіх ухілаў.

Актыў адзначае вялікія дасягненьні партыі ў справе барацьбы за ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі, у справе інтэрнацыянальнага выхаваньня працоўных мас. Актыў лічыць патрэбным праводзіць далейшую паглыбленую работу партыйных, савецкіх, прафэсыянальных і культурнасьветных арганізацый у галіне беларусізацыі, у галіне вылучэньня і выхаваньня карэнных пралетарскіх кадраў. Партыя мае вялікія посьпехі ў барацьбе з клясавым ворагам, які выступае пад нацыяналістычнай маскай партыя пераможна ліквідуе вынікі шкодніцкай работы беларускіх нацыянал-дэмакратаў, а таксама дае бязьлітасны адпор антыпартыйным выступленьням нацыянал-апартуністаў, агентаў вялікадзяржаўна-расійскага і мясцовых шавінізмаў. Разгорнутае сацыялістычнае будаўніцтва ў трэцім годзе пяцігодкі, абвастрэньне ваеннай небясьпекі патрабуюць далейшага ўзмацненьня пільнасьці працоўных мас і барацьбы супроць вялікадзяржаўна-расійскага і мясцовых шавінізмаў, які ва ўмовах непераможаных яшчэ рэшткаў эканамічнай і культурнай нацыянальнай нерасьцьці, як спадчыны царызму, зьяўляецца галоўнай небясьпекай на даным этапе. супроць беларускага контррэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму, шавінізму іншых колераў, а таксама супроць нацыянал-апартунізму.

4. Актыў цалкам ухваляе пастанову ЦК КП(б)Б аб выключэньні з радоў партыі нацыянал-апартуністаў Ігнатоўскага і Жылуновіча і заварае ЦК КП(б)Б, што будзе шырэйшая весьці пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б барацьбу з рэшткамі групоўшчыны і дасьць рашучы адпор спробам аслабіць манолітнасьць ленінскай партыі праз групавую барацьбу. Вялізарныя задачы, пастаўленыя пленумам ЦК КП(б)Б, могуць быць і будуць выкананы, калі партыйныя масы яшчэ з большай сілай будуць захоўваць сталёвае адзінства нашай партыі.

Актыў прызнае зусім правільнай ацэнку, дадзеную пленумам рабоце спажывецкай кааперацыі і органаў рабочага забясьпячэньня, якія яшчэ не пераключыліся на сапраўднае і поўнае абслугоўваньне рабочага спажыўца, якія яшчэ не павярнуліся тварам да вытворчасьці.

Важнейшай задачай партарганізацыі актыў лічыць узмацненьне органаў кааперацыі і рабочага забясьпячэньня, ачыстку іх ад чужых, прымазаўшыхся, ганджарскіх, меншавіцкіх бундаўскіх элемэнтаў.

На аснове тых посьпехаў, якіх мы дабіліся ў справе вырашэньня праблем рабочага забясьпячэньня, мы маем магчымасьць значна палепшыць пастанову гэтай справы.

Пашырэньне сеткі заводзкіх сталовак, рашучае паляпшэньне іх работы, арганізацыя новых зачыненых разьмеркавальнікаў, узмацненьне існуючых, суровае захаваньне клясавага прынцыпу пры разьмеркаваньні дэфіцытных тавараў, ажыцьцяўленьне поўнага павароту тварам да вытворчасьці, бальшавіцкая работа ў галіне арганізацыі прыгарадных гаспадарак—гэтай базы забясьпячэньня рабочых цэнтраў гародніной і іншымі прадуктамі першачарговай важнасьці,—вось асноўныя задачы, якія стаяць перад кааперацыяй і выкананьне якіх дасьць патрэбны пералом у справе рабочага забясьпячэньня.

Актыў лічыць патрэбным значна ўзмацніць рабочы кантроль над працай усіх зьвеньняў кааперацыйнай сыстэмы і даручае гаркому распрацаваць практычныя мерапрыемствы ў гэтым напрамку.

Тое значэньне, якое набываюць у пэрыяд разгорнутага сацыялістычнага наступленьня саветы, патрабуе сталай увагі партарганізацыі да пытаньняў палепшэньня работы саветаў, павялічэньня іх ролі ў барацьбе за генэральную лінію партыі.

Перавыбары Менскага гарсавету пра ходзяць ва ўмовах вялізарнага вытворчага ўздыму рабочых мас. вялікай актыўнасьці рабочых-выбаршчыкаў. Імкненьня рабочых дапамагчы перабудове работы саветаў. Процант яўкі рабочых на выбарчыя сходы (95-100), бальшавіцкая дзелавая крытыка работы мінулага складу, сотні новых і важных рабочых прапаноў аб далейшай рабоце — ствараюць усе прадпасылкі для сапраўднага ператварэньня Менскага гарсавету ў баявы орган пралетарскай дыктатуры.

Актыў адзначае апартуністычны характар справаздачы, выпушчанай мінулым кіраўніцтвам гарсавету, і ўхваляе мерапрыемствы гаркому і гар. КК у адносінах да віноўных за выпуск гэтай справаздачы і арганізацыю ўсяго далейшага ходу справаздачна-перавыбарчай кампаніі.

Актыў лічыць важнейшай задачай Менскай партарганізацыі ўзмацненьне і перабудову усёй працы Менскага гарсавету.

Актыў са ўсёй рашучасьцю асуджае антыпартыйнае, права-«лявацкае» выступленьне тав. Смаля і прызывае ўсю арганізацыю даць бязьлітасны адпор падобным хлусьлівым паклёпам на КП(б)Б і рабочую клясу.

Актыў заклікае партарганізацыю аддаць максымум энэргіі для правядзеньня ў жыцьцё ўсіх пастаноў пленуму, мабілізуючы вакол гэтых пастаноў ініцыятыву і энэргію рабочых мас.

Па-бальшавіцку перабудаваць работу

Кіраўніцтвам Бабруйскага гарсавету дапушчаны рад апартуністычных памылак

(Ад нашага бабруйскага карэспандэнта)

Бабруйскі Гарадзкі савет у сваёй рабоце за апошнія два гады меў шэраг вялізарнейшых прарываў. У яго рабоце мела месца права-апартуністычная практыка, яскрава выражаная ў тым, што гарадзкі савет, ня гледзячы на наяўнасьць 70-тысячнай надоімкі па розных падатках з кулацка-нэпманскага элемэнту ня прыняў ніякіх мер да спагнаньня гэтай недаімкі. Мелі месца і «левыя» заскокі; яны выразіліся канкрэтна ў грубым адміністраваньні прэзыдыуму гарадзкога савету над прыгарадным калгасам імя Гарсавету. Прэзыдыум гарадзкога савету сваёй пастановаю распусьціў праўленьне калгасу, выключыўшы рад калгасьнікаў з калгасу, шмат якім вынес розныя спагнаньні, не прыцягнуўшы да гэтага калгасную грамадзкасьць.

Гарадзкі савет не стаяў на чале барацьбы за выкананьне прамфінпляну. У той час як на шэрагу прадпрыемстваў Бабруйску выкананьню прамфінпляну, напражалі вялікія прарывы, гарадзкі савет не прыняў ніякіх мер да іх ліквідацыі. Прамысловая сэкцыя, якая павінна была займацца пытаньнямі вытворчага парадку, пытаньнямі выкананьня прамфінпляну амаль што зусім не працавала. Ня гледзячы на гэта гарадзкі савет ня прыняў ніякіх мер да таго, каб наладзіць работу гэтай сэкцыі.

Кіраўніцтва Бабруйскага гарадзкога савету, можна сьмела сказаць, зусім стаяла ў баку ад пытаньняў грамадзкага харчаваньня і рабочага забясьпячэньня, часам, тармазіла правядзень не мерапры

МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ БАРАЦЬБЫ З БЕСПРАЦОЎЕМ

ПАРЫЖ. 22-I. Орган французкай кампартыі «Юманітэ» агалашае адозву генэральнай унітарнай (рэвалюцыйнай) канфэдэрацыі працы да ўсіх працоўных.

Адозва прапануе працоўным рыхтаваць да масавага ўдзелу ў правядзенні міжнароднага дню барацьбы супроць беспрацоўя і надыходзячай вайны (25 лютага). З гэтай мэтай раіцца ствараць усюды камітэты барацьбы, камітэты беспрацоўных і праводзіць канфэрэнцыі адзінства усіх працоўных.

Палітбюро французкай кампартыі, далучаючыся да адозвы генэральнай унітарнай (рэвалюцыйнай) канфэдэрацыі працы, абавязала ўсіх членаў партыі праводзіць у жыцьцё намечаныя ў адозве мерапрыемствы.

***

БЭРЛІН. 24-I. Адбылася канфэрэнцыя прадстаўнікоў беспрацоўных 50 бірж працы, на якой абгаворваліся мерапрыемствы, па падрыхтоўцы да міжнароднага дню барацьбы супроць беспрацоўя 25 лютага. Канфэрэнцыя выпрацавала праграму мерапрыемстваў і прыняла рэзалюцыю, у якой пералічаны патрабаваньні беспрацоўных.

***

ВЕНА, 23-I. Аўстрыйская кампартыя разгарнула работу па мабілізацыі мас беспрацоўных і работніц для правядзеньня міжнароднага дню барацьбы з беспрацоўем—25 лютага.

Бурная дэманстрацыя беспрацоўных у Кішэнёве

ВЕНА. 27-I. Паводле паведамленьня з Румыніі ў Кішэнёве адбылася шматлюдная дэманстрацыя беспрацоўных. Напярэдадні дэманстрацыі па ўсім горадзе распаўсюджваліся камуністычныя лятучкі, заклікаючыя рабочых змагацца супроць падрыхтоўкі вайны і выступіць пад сьцягам Леніна ў абарону Савецкага Саюзу, супроць жорсткага наступу капіталістаў на рабочую клясу.

У дзень дэманстрацыі Кішэнёў рабіў ўражаньне вайсковага лягеру. Войска заняло ўсе грамадзкія будынкі, заводы, стараючыся недапусьціць выступленьня беспрацоўных. Ня гледзячы на гэта, рабочыя, асабліва рабочая моладзь, пад кіраўніцтвам камсамольцаў, вялікімі групамі дэманстравалі на вуліцах увесь дзень. Яшчэ да пачатку дэманстрацыі паліцыя правяла больш 200 арыштаў.

Новы прыказчык французскага імпэрыялізму

БЭРЛІН, 27. У перадавой, прысьвечанай фарміраваньню новага французскага габінэту, «Ротэ Фанэ» піша: «Габінэт Лаваля зьяўляецца ваенным габінэтам, яго трэба разглядаць, як адказ французскага імпэрыялізму на працэс «прэмпартыі».

За габінэтам Лаваля стаіць Пуанкарэ, які паслаў туды сваіх лепшых сяброў. Урад пуанкарыстаў яшчэ больш абвострыць антысавецкую палітыку Францыі. Так фарміраваньне новага французскага габінэту сыгналізуе эўра пэйскай рабочай клясе, які курс імпэрыялізм будзе весьці пры растучым абвастрэньні крызісу капіталістычнай сыстэмы».

„Пяцігодка адкрывае новую і лепшую эру лёсу чалавецтва"

ПАРЫЖ. 21-I. У газэце «Пары Суар» французскі журналіст Трамэн (адзіны буржуазны французкі журналіст, які прыехаў на працэс «прэмпартыі») агалашае гутарку з адным з амэраканскіх інжынэраў, працуючых у СССР.

На заўвагу Трамэна, што на савецкіх заводах маюцца толькі асобныя французкія спэцыялісты, у процівагу нямецкім і амэрыканскім, Трамэн атрымаў наступнае тлумачэньне ад амэрыканца. «У Францыі—сказаў амэрыканец—распаўсюджваюць хлусьню аб няўдачах пяцігодкі і гэтым стараюць сярод спэцыялістаў неспрыяючыя адносіны да СССР». Супярэчачы Трамэну да заўвагі аб недахопах будаўніцтва ў СССР, інжынэр заявіў: «калі будуецца краіна, якая ў 42 разы больш Францыі, шматкі і хібы зусім натуральныя».

Асначаючы кансэрватыўнасьць Францыі ў адносінах да СССР і нямінучую неабходнасьць прызнаньня, рана ці позна, існаваньня СССР усімі краінамі сьвету, інжынэр падкрэсьліў, што Францыя ў імя асабістых інтарэсаў некаторых сваіх грамадзян, патрабуючых звароту даўгоў, ці камэрцыйных прывілей, траціць значныя магчымасьці для скарыстаньня прадукцыі сваёй прамысловасьці і для прыстасаваньня тэхнічных ведаў сваіх спэцыялістаў.

Параўноўваючы становішча СССР і Нямеччыны інжынэр адзначыў, што ў СССР становішча з кожным годам паляпшаецца, у адрозьненьне ад Нямеччыны, якая мае толькі-ж крэдытаў колькі і даўгоў, тымчасам як СССР ня мае ні даўгоў, ні крэдытаў. **Інжынэр далей адзначае немагчымасьць правалу пяцігодкі, якая адкрывае «новую і лепшую эру лёсу чалавецтва».** У гэтым інжынэр бачыць прычыну працоўнага энтузіязму шырокіх савецкіх мас.

Антысавецкая кампанія пад кіраўніцтвам Фіша

ВАШЫНГТОН. 24-I. Фіш прадоўжвае дамагацца разрыву савецка-амэрыканскіх гандлёвых зносін.

У гэтых мэтах ён склікаў нараду членаў кангрэсу, якія прадстаўляюць лесапрамысловыя штаты. Нарада ўшаноўвала т. Фіша наначыць камітэт у складзе 25 членаў кангрэсу, якія прадстаўляюць штаты, выраблюючыя тавары, якія канкуруюць з савецкімі таварамі. Задача камітэту прыняць меры «да самаабароны» супроць савецкага экспарту.

Міжнародная хроніка

⊙ Паводле паведамленьня з **Швэйцарыі**, на італьянскага генэральнага консула ў Цюрыху быў зроблены замах у памяшканьні консульства. Консул цяжка паранены стрэлам з рэвальвэру. Асоба, якая рабіла замах дагэтуль ня выкрыта. Буржуазны друк міркуе, што рабіўшы замах—антыфашыст, якому было адмоўлена ў аднаўленьні пашпэрту.

⊙ Паводле паведамленьня з **Грэцыі**, у Салёніках, а таксама і ў горадзе Эраме арганізаваны фашысцкі саюз на барацьбе з камуністычным і рабочым рухам ў Грэцыі. Абодвы фашысцкія саюзы неафіцыйна падтрымліваюцца грэцкім урадам.

⊙ Як паведамляюць з **Балёньні** (Грэцыя), мясцовай паліцыяй нібы выкрыта нелегальная камуністычная арганізацыя. Праведзены шматлікія арышты.

⊙ У **Італіі** створана новая паліцэйская арганізацыя спэцыяльна для барацьбы з «анты-фашысцкімі злачынствамі». Новая арганізацыя зьяўляецца сэкцыяй хаўранкі.

⊙ Як паведамляюць з **Атэнаў**, там окончыўся працэс 5 камуністаў, якіх абвінавачваюць у камуністычнай прапагандзе сярод салдатаў і рабочых. Суд прыгаварыў абвінавачваных, на падставе «закону аб абароне дзяржавы», да 3-х год астрожнага зьняволеньня кожнага і да аднаго году высылкі.

⊙ Водлуг афіцыйных данных, 15 студзеня ў **Нямеччыне** налічвалася **4.765 тысяч** беспрацоўных, г. зн. на **408 тысяч** больш, чымся 31 сьнежня. 1.630 тысяч беспрацоўных ці зусім пазбаўлены пэнсіі, ці атрымліваюць нікчэмную дапамогу па беднасьці.

⊙ Водлуг афіцыйных даных, колькасьць беспрацоўных у **Польшчы** на 10 студзеня дасягнула **321.500 чал.** З 3-га па 10-е студзеня армія беспрацоўных павялічылася на **18.300 чал.** Паводле афіцыйнай статыстыкі, паўбеспрацоўных на 10 студзеня налічваецца **121 тысяча.** Больш паловы паўбеспрацоўных працуюць **ад 1 да 3 дзён у тыдзень.** Толькі 101 тысяча беспрацоўных атрымлівае пэнсію.

⊙ Колькасьць зарэгістраваных беспрацоўных у **Англіі** складала на 12 студзеня **2.636. 168 чал.** г. зн. на 18.396 чал. больш, чымся за тыдзень да гэтага, і на **1.159.907 чал.** больш, чымся год таму назад.

Новыя перамогі чырвоных войск Кітаю

ШАНХАЙ. 27-I. Кітайскі друк паведамляе аб новых баёх паміж чырвонымі арміямі і нанкінскім войскам у паўднёвых правінцыях Кітаю.

Афіцыйныя крыніцы штодня паведамляюць аб «перамогах» нанкінскага войска над чырвонаармейскімі атрадамі, захваце савецкіх тэрыторый і аб ліквідацыі савецкіх органаў на занятых тэрыторыях. Мясцовыя колы адносяцца да гэтых пераможных рэляцый надзвычайна асьцярожна.

Замежны-ж друк агалашае даныя аб посьпеху чырвоных армій. Амэрыканская газэта «Іўнінг Пост» паведамляе, што 15 тысяч чырвонаармейцаў занялі вялікі раён ў правінцыях Хунань. У правінцыі Цзяньсі чырвонаармейскія атрады ўмацаваліся ў радзе гарадоў. З Нанкіну паведамляюць, што Чан-Кай-Шы загадаў выслаць новую армію ў 100 тысяч салдатаў у правінцыі Хубэй, Хунань і Цзяньсі.

***

ШАНХАЙ. 27-I. У буйных кітайскіх газэтах упяршыню агалашаюцца весткі аб стаповішчы на савецкіх тэрыторыях.

Газэта «Шэнь-Бао» агалашае паведамленьні аб становішчы ў Тунгу (правінцыя Цзяньсі). У гэтым горадзе існаваў савецкі ўрад і ён зноў існуе пасьля выгнаньня нанкінскага войска чырвонаармейскімі атрадамі з гораду. За 3-х гадовы летні пэрыяд існаваньня савецкі ўрад пабудаваў склады для хаваньня рыжу і ў выпадку голаду ці засухі прадаваў насельніцтву рыж па цьвёрдых цэнах (у 3 разы таней, чымся у іншых раёнах). Насельніцтва гораду не цярпела патрэбы ў прадуктах, бо яны прадаваліся па вызначаных нізкіх цэнах. У раёне мяліся школы для дзяцей і для дарослых і функцыянавала некалькі дарэмных больніц, клінік і санаторый. У раёне была ўведзена адзіная савецкая грашовая сыстэма. Водлуг заявы карэспандэнта насельніцтва раёну Тунга ня ведала голаду і ня ведала недаяданьняў. Карэспандэнт зазначае, што ўвайшоўшае ў Тунгу нанкінскае войска «вельмі пацярпела ад насельніцтва, якое цалкам перайшло на бок чырвонаармейцаў і дапамагала ім зноў заняць і ўмацаваць у Тунгу».

ПА САВЕЦКІМ САЮЗЕ

Пасяджэньне Савету Працы і Абароны

МАСКВА, 26-I. 26 студзеня пад старшынствам тав. Молатава адбылося пасяджэньне Савету Працы і Абароны.

Заслухаўшы даклад НК Шляхоў Зносін аб выкананьні студзеньскага пляну і аб лютаўскім пляне перавозак, Савет Працы і Абароны даў дырэктывы НК Шляхоў Зносін па пытаньні аб выкананьні лютаўскага пляну, устанаўленьні чарговасьці грузаў і г. д.

З прычыны таго, што праграма вагонабудаўніцтва на 1931 г. (40.000 вагонаў), перавышаючая больш чымся ў два разы адзведную праграму леташняга году, усё-ж аказалася недастатковай, Савет Працы і Абароны прызнаў неабходным для забесьпячэньня ўзрастаючага грузазвароту чыгункі па вялічышь праграму вагонабудаўніцтва ў гэтым годзе. Адпаведнае заданьне дана распрацаваць ВСНГ СССР Дзяржпляну.

Савет Працы і Абароны разглядаў таксама пытаньне аб гарадзкіх будаўнічых арганізацыях і пытаньне аб выкананьні фінансавага пляну за студзень даўшы неабходныя дырэктывы адпаведным гаспадарчым органі зацыям па мясцох.

XIII-я гадавіна дзікага разгулу белага тэрору ў Бэсарабіі

ТЫРАСПОЛЬ, 28. У сувязі з 13-й гадавінай акупацыі Бэсарабіі адбыўся вялікі мітынг пратэсту. Выступаўшыя на мітынгу рабочыя, а таксама бэсарабцы-бежанцы абрысавалі жудасны малюнак дзікага разгулу белага тэрору ў Бэсарабіі.

У той час, калі Савецкая Маддавія разьвівае сацыялістычнае будаўніцтва, стварае сотні школ, тэхнікумы, будуе агракамбінат, Бэсарабія—эканамічна і культурна разбурана. У Бэсарабіі, дзе 48.000 малдаван, няма ніводнай малдатскай школы, там 85 проц. няпісьменных і разам з тым тысячы беспрацоўных настаўнікаў. У адзначаленна прыняцьвай рэзалюцыі мітынг паслаў брацкае прывітаньне Бэсарабскім працоўным, якія зматаюцца за сваё вызваленьне ад гнёту баяр.

Дзесяцідзённая галадоўка па літзьняволеных

КАЎНАС, 27. Літоўскі друк паведамляе аб спыненьні дзесяцідзённай галадоўкі палітзьняволеных у Ковенскай турме. Пракуратура стараецца часткова задаволіць патрабаваньне палітзьняволеных аб палепшаньні турэмнага рэжыму.

„Масавы белы тэрор на Заходняй Украіне--пачатак грамадзянскай вайны і пралетарскай рэвалюцыі"

ХАРКАЎ, 28. Першы зьлёт работніц і калгасьніц-ударніц Харкаўшчыны зьвярнуўся з заклікам да рабочых і працоўных сялянства Заходняй Украіны.

«Мы напружваем увагу,—гаворыцца ў этым заклику,—сочым за шквалам жорсткай клясавай барацьбы, якая адбываецца зараз на Заходняй Украіне. Мы з энтузіязмам вітаем гераічных правадыроў рэвалюцыйнага пралетарыяту, якія бясстрашна церпяць нячуглыя катаваньні фашысцкай охранкі, ад даюць сваё жыцьцё, але не адступаюць ні на крок перад шалёным наступам клясазага ворага. Мы добра разумеем, што сучасныя формы масавага белага тэрору на Заходняй Украіне ёсьць ужо пачатак грамадзянскай вайны і пралетарскай рэвалюцыі. Мы разумеем, што на Заходняй Украіне Пілсудзкі «ачышчае» тэрыторыю для ваенных эпэрацый, накіраваных супроць Савецкага Саюзу наогул і Савецкай Украіны ў прыватнасьці.

У адказ на ваенную падрыхтоўку польскага фашызму, мы прыложым усе сілы, каб выкаранаць і перавыкаваць пяцігодку ў чатыры гады, каб дапамагчы гераічнай барацьбе пралетарыяту Заходняй Украіны, мы ўзмоцнім арганізацыю МОПР'а і работу міжнароднай сувязі».

У дэкаду штурму ўзьняць працоўныя масы на барацьбу

ЗА 100 проц. ахоп школай дзяцей школьнага ўзросту, поўнае выкананьне плянаў ліквідацыі няпісьменнасьці, палітэхнізацыю школы.

Культэстафэта прайшла слаба

—адзначыў зьлёт культармейцаў Лёзьнянскага раёну

20 студзеня ў **Лёзьнянскім раёне** адбыўся першы раённы зьлёт культармейцаў. На зьлёт зьявілася 120 культармейцаў. З рапарту **Замшынскага сельсавету** відаць, што па гэтым сельсавеце было праведзена 12 сходаў, на якіх стаяла пытаньне аб значэньні культэстафэты. На гэтых сходах было завербавана 170 культармейцаў,—гэта апроч настаўнікаў і вучняў. Пры правядзеньні культэстафэты выявілі 153 няпісьменных і дадаткова арганізавалі 2 ліквпункты.

Зараз у Замшынскім сельсавеце **плян па арганізацыі ліквпунктаў перавыкананы, працуе 8 ліквпунктаў. Усеагульным навучаньнем ахоплены ўсе дзеці школьнага ўзросту.** Праведзена растлумачальная работа па пытаньні падвозу дзяцей у школу. У выніку бацькі сваіх дзяцей па чарзе падвозяць у школы. Для 8 вучняў пры Замшынскай школе арганізаваны інтэрнат. Была праведзена растлумачальная работа і па палітэхнізацыі школы. Пры школах арганізаваны рабочыя пакоі. Бацькі ідуць на дапамогу. Усе школы прымацаваны да калгасу. Узмоцнена працуюць чырвоныя куткі, якіх па сельсавеце маецца 6. **Выпіска газэт па сельсавеце павялічылася на 50 проц.**

У Чарнішкім сельсавеце пры правядзеньні культэстафэты поўнасьцю выяўлены няпісьменныя, якіх налічваецца 269 чалавек. Толькі 8 вучняў школьнага ўзросту не ахоплены школай. З пасьці школ пяць прымацаваны да калгасаў. Па сельсавеце працуе 10 чырвоных куткоў. Узмоцнена работа хаты-чытальні. Сіламі культармейцаў распаўсюджана 263 кнігі. Горш цаў распаўсюджана 263 кнігі. Горш цаў распаўсюджана 263 кнігі. Горш ц

У АВАНГАРДЗЕ БАЛЬШАВІЦКАЙ ВЯСНЫ

павінны ісьці калёны саўгасаў і калгасаў

Раўняйцеся па калгасу „Колас". Высоўвайце сустрэчныя пляны сяўбы. Арганізуйце новы калгасны прыліў. Узмацняйце дружбу з аднаасобнікамі—беднякамі і сераднякамі

ДАН СТАРТ ПАСЕУНАЙ ЭСТАФЭТЫ У ЧАШНІЦКІМ РАЁНЕ

Пры шчыльнай сувязі з аднаасобным сэктарам

калгас „Колас" высунуў сустрэчны плян сяўбы

У АДКАЗ АПАРТУНІСТАМ ЯРАВЫ КЛІН БУДЗЕ ПАШЫРАНЫ СУПРОЦЬ КАНТРОЛЬНЫХ ЛІЧБАЎ НА 22 ПРОЦ. АДНААСОБНІКІ ІДУЦЬ УНОГУ З КАЛГАСЬНІКАМІ.

(Ад нашага магілеўскага карэспандэнта)

Атрымаўшы плян веснавой сяўбы ад Райкалгассаюзу, калгас «Колас» па-ўдарнаму пачаў падрыхтоўку. Адразу плян быў абгавораны на праўленьні калгасу, вытворчай нарадзе і агульным сходзе калгасьнікаў пры шырокім удзеле бядняцка-серадняцкіх мас вёсак.

Калгасьнікі высунулі свой сустрэчны плян, у якім яны абавязуюцца пашырыць яравы клін на 48 га ,або на 22 проц. супроць кантрольных лічбаў, дадзеных калгасу Райкалгассаюзам.

Па паасобных культурах калгасьнікі абавязаліся пашырыць яравы клін а ўласна: пад бульбаю—65 га, супроць пляну ў 63 га, пад ячменем—20 га, супроць 16 га паводле пляну, капюшыняю да 32 га (больш пляну на 2 га), пад аўсом 80 га, замест 42 га, пад канопляміі—4 га, супроць пляну ў 3½ га.

Калгас поўнасьцю засьпаў насенны фонд і прыступіў да яго ачысткі. Інвэнтар і машыны, якія падлягаюць рамонту ўжо здадзены ў кузьню для рамонту.

Калгас мае посьпехі ў справе новага калгаснага прыліву бядняцка-сераднякіх гаспадарак. На агульным сходзе калгасьнікаў з аднаасобнікамі, пры абгаворэньні пляну веснавой пасеўкампаніі, 6 аднаасобных гаспадарак падалі заявы аб уступленьні ў калгас.

На гэтым-жа сходзе 41 бядняцка-серадняцкая гаспадарка аднаасобнікаў абавязалася дапамагчы калгасу ў вывазцы лесаматэрыялу для будаўніцтва. Абавязацельсты гэтае ужо ажыцьцяўляецца.

А. НЁМАНСКІ

Арганізуем эстафэту падрыхтоўкі да веснавой сяўбы

Будзем упарта змагацца за рэалізацыю эстафэты

Чашніцкі раён з мэтаю большага ўцягненьня грамадзкасьці ў падрыхтоўку да веснавой пасеўнай кампаніі арганізаваў пасеўную эстафэту і выклікае ўключыцца ў эстафэту рэшту раёнаў БССР.

Намечана 7 маршрутаў эстафэты, на якіх яна павінна праходзіць на працягу ўсяе другой бальшавіцкай вясны.

Першы маршрут—гэта **ўзмацненьне і пашырэньне сацыялістычнага сэктару сельскае гаспадаркі** і вытворчае каапераваньне. Эстафэта па гэтым маршруце ахапляе ўсю работу ўнутры сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі, а ўласна: разьмеркаваньне ўраджаю, складаньне вытворчых пляноў, арганізацыя працы і вучот яе, перанязьбары праўленьня калгасаў, арганізацыя калгаснага прыліву, арганізацыя новых калгасаў, ахоп вытворча-каапэрацыйнымі аб'яднаньнямі ўсіх бядняцка-сераднякіх гаспадарак, што не ўвайшлі яшчэ ў калгас, праверка кіраўніцтва і ўдзел сельсавету ў арганізацыі новага прыліву ў калгасы.

Другі маршрут мае на мэце **пашырэньне пасеўных плошчаў пад яравыя культуры** шляхам разораваньня сухадолаў, выгонаў і залежаў, распрацоўкі хмызьняку, арганізацыі мэліярацыйных работ і скарачэньня плошчаў папару.

Трэці маршрут накіраван на **падняцьце ўраджайнасьці**, а ўласна: забясьпечыць 100 процантную ачыстку насеньня, засеяць увесь яравы клін ачышчаным насеньнем, прыняць захады да пратручваньня насеньня, разганачыць збор попелу і прасоўваньне штучных угнаеньняў, скарыстаць торф на ўгнаеньне, забясьпечыць дастаўку ваны для вапнаваньня глебы, палепшыць сенажаці, пашырыць радковы засеў і засеяць суцэльныя масівы як у калгасах, так і ў паасобных паселішчах гатункоўым насеньнем.

Чацьверты маршрут—ажыцьцяўленьне мерапрыемстваў па спэцыялізацыі сельскае гаспадаркі. Тут прадугледжваецца забясьпечыць поўнасьцю выкананьне пляну засеву лёну і канапель, прычым абавязкова гатункоўым насеньнем, а таксама падрыхтаваць будаўніцтва лёнаапрацоваўчых пунктаў.

Пяты маршрут—гэта жывёлагадоўля. Паводле гэтага маршруту трэба праверыць і забясьпечыць калгасы і паселішчы цягавай сілай, разгарнуць тадоўлю маладняка, сачыць за выкананьнем пастановы аб забароне забою жывёлы, правесьці мерапрыемствы па стварэньні кармавой базы, устанавіць нормы кармленьня жывёлы, падрыхтаваць будаўніцтва кароўнікаў, сьвінарнікаў і сілосных вежаў, прасачыць за арганізацыяй злучных пунктоў коняй. Неабходна таксама правесьці, арганізаваць малочную сетку. Поруч з гэтым—рашуча змагацца з забоем коняй. Неабходна таксама правесьці падрыхтоўку спэцыяльных гаспадарак да прыёмкі прадукцыйнай жывёлы.

Шосты маршрут прадугледжвае **стварэньне насенных фондаў і рамонт інвэнтару.** Мэты гэтага маршруту—забясьпечыць веснавую сяўбу неабходнай колькасьцю добраякаснага насеньня, забясьпечыць стварэньне насенных і страхавых фондаў і ўзарамантаваць сваячасова сельска-гаспадарчы інвэнтар.

І ўрэшце апошні—сёмы маршрут ахапляе **масава - палітычную работу, накіраваную на выкананьне пляну веснавой сяўбы.** Ён ідзе па шляху шырокай работы калгасьнікаў і бядняцка-сераднякіх мас вёскі на пасьпяховае выкананьне пляну веснавой сяўбы, мабілізуючы масы батрацтва і беднаты на барацьбу з кулацтвам і правааапартуністычнай стаўкай на самацёк не дапушчаючы замены сапраўднай арганізацыі мас мерамі адміністраваньня і запалохваньня.

Па гэтым маршруце належыць таксама шырока разгарнуць работу па даведзеньні пляну сяўбы да калгасаў, паасобных паселішч і бядняцка-сераднякіх двароў, шырока абгаварыўшы гэтыя пляны з тым, каб былі высунуты сустрэчныя пляны. У мэтах стварэньня адпаведных кадраў, правесьці работу па падборы калгасьнікаў на сельска-гаспадарчыя курсы. Шырока прасунуць у калгасы і паасобныя паселішчы кнігі і газэты, высунуўшы лёзунг: «адна газэта на 2 двары». Перабудаваць работу хат-чытальняў і чырвоных куткоў у напрамку выкананьня пляну веснавой сяўбы. Праверыць наколькі школы, лікпункты і інш. культасьветныя ўстановы прыстасавалі сваю работу на выкананьне пляну пасеўкампаніі.

Наогул уся работа па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы будзе праходзіць пад знакам шырокага разгортваньня сапспаборніцтва, ударніцтва, прамадзкага буксіру, сустрэчных пляноў, крытыкі і самакрытыкі.

Райштаб.

Змагацца за тэхнічныя культуры

З 1-га студзеня ў калгасе «Пераможца», Рагачоўскага раёну, пачалася падрыхтоўка да веснавой сяўбы. Насьцежаэта зьмясьціла ўпад артыкулаў, якія заклікаюць разгарнуць падрыхтоўку да сяўбы, увязаўшы яе з працы лівам у калгас аднаасобнікаў. Адбылося паседжаньне праўленьня, на якім разгледзела кантрольныя лічбы сяўбы па кожнай культуры.

Падрыхтоўка да сяўбы пачалася; насенныя фонды па некаторых культурах ужо створаны. З боку праўленьня, ёсьць зусім неадаровая думка: некаторыя члены праўленьня імкнуцца скараціць пасевы тэхнічных культур, як бульбы, ільну.

Кармавое пытаньне зусім не адбіта ў пляне, скарочаны пасеў вікі на сена і іншых кармовых траў. Дрэнна справа з рамонтам: на складах няма ніводнага кавалка жалеза, што адбіваецца на рамонце плугоў, барон і іншага інвэнтару.

Апранамія ў складаньні вытворчых пляноў у калгасах ня прымае ўдзелу, а самі калгасьнікі ня могуць скласьці іх.

Я.Савіцкі.

Арганізуем вясеньнія ўдарныя брыгады

Калгас імя Сталіна, Сьмілавіцкага р-ну, пачаў паўдарнаму рыхтавацца да веснавой сяўбы. Плян сяўбы абгаворан на агульным сходзе калгасу. Калгасьнікі абвясьцілі сябе ўдарнікамі па правядзеньні 2-й бальшавіцкай вясны.

У калгасе створаны ўдарныя брыгады па рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтару. Кожная брыгада ўзяла на сябе абавязак правесьці работу ўдарна. Увесь інвэнтар ужо прыведзен у належны парадак. Ачыстка насеньня пачалася сваячасова, калгас ужо ачысьціў палову свайго насеньня.

Пляны веснавой сяўбы ў калгасе ёсьць. Кожны калгасьнік знаём з плянам. Работа па падрыхтоўцы да вясны праходзіць па ўдарнаму.

Брыгадзір.

Камунараўцы арганізуюць Ленінскі прыліў

ГОМЕЛЬ. 25-I. Па Гомельскім раёне ў Ленінскія дні ўзьнялася хваля калгаснага прыліву ў старыя калгасы і арганізацыі новых калгасаў.

За апошнюю дэкаду арганізаваны ня выя калгасы ў вёсцы Раманавічах з 60 гаспадарак, у вёсцы Ларышчава—90 гаспадарак, Бабовічы—9 гаспадарак, Клімаўка—30 гаспадарак. У калгас «Камунар» уступіла за кароткі тэрмін 64 гаспадаркі.

Неабходна адзначыць баявую работу калгасьнікаў «Камунар», якія за апошні час павялічылі склад калгасу з 26 да 90 гаспадарак. У калгасе былі створаны вярбовачныя групы; кожны калгасьнік узяў на сябе абавязак уцягнуць яшчэ адну гаспадарку ў калгас. Такая работа ўзьняла новую хвалю калгаснага прыліву.

Калгас «Камунар» зьяўляецца лепшым калгасам у раёне. За пасьпяховае правядзеньне асеньняй пасеўнай кампаніі і ўдарную вярбоўку ў калгас, «Камунар» атрымаў ганаровы сьцяг.

М. Р.

Высоўваем сустрэчны плян

Пасеўную плошчу ярыны павялічваем на 30 проц.

Калгас «Прамень Кастрычніка», Каралінскага раёну, пачаў рыхтавацца да веснавой пасеўнай кампаніі. 15 студзеня адбылася нарада вытворчай камісіі калгасу, на якой выпрацавалі плян веснавой сяўбы.

Па сяўбе розных культур рашылі даць сустрэчны плян; засеўную плошчу павялічваем на 30 проц. Усяго-ж яравымі культурамі вызначана засеяць 190 га.

Калгасьнікі, падзяліўшыся на брыгады, заняліся малацьбой. З мэтай хут чэйшага заканчэньня малацьбы ўстана вілі дзьве малатарні. Праца праводзіцца кожны дзень.

Калгасьнікі сустрэнуць веснавую пасеўкампанію падрыхтаванымі і правядуць яе ўдарна, па бальшавіцку.

У. М.

ПА-БАЛЬШАВІЦКУ БУДАВАЦЬ МТС

Змагацца з апартуністычнай недаацэнкай машына-трактарных станцый

Надышоў самы гарачы час будаўніцтва МТС. Цяпер на стварэньне апошніх пунктаў суцэльнай калектывізацыі—машына-трактарных станцый павінен быць накіраван максымум увагі.

Што-ж мы бачым на самай справе? Апартуністычная недаацэнка, нязважлівасьць да МТС у шмат якіх раёнах—іншага адказу ісьльга знайсьці: аб гэтым шмат гаварылі на Ўсебеларускай нарадзе дырэктароў МТС і старшых аграномаў, якая працавала ад 25 да 27 студзеня. Нам досыць праглядзець інфармацыі дырэктароў МТС, каб упэўніцца ў гэтым.

Капыльская МТС знаходзіцца ў самых найгоршых умовах. Раённая арганізацыі зусім не дапамагаюць МТС ні разгортваюць дагаворную кампанію, ні па рэалізацыі акцый Трактарацэнтру, ні па рамонту трактараў. Будынак, што будуецца для МТС, зусім дрэнны. **У Мсьціслаўлі** наглядаецца тое-ж самае: раённыя арганізацыі стаяць у баку ад будаўніцтва МТС; яны ня ўключылі гэта ў свой плян. Райвыканком нават ня ўключыў у плян мабілізацыі сродкаў насельніцтва па рэалізацыі акцый Трактарацэнтру. Наогул у раёне з падрыхтоўкай да сяўбы вельмі дрэнна. Ніякай пляновай работы няма —усё робіцца самацёкам, без падліку. Да гэтага часу невядома колькасьць пасеўнага насеньня для калгасаў. Пры складаньні вытворчых пляноў у калгасах МТС ня ўлічваецца. Райкалгасаюз ня водае, колькі ў яго першапачатковых таварыстваў.

Таксама перашкаджае ў працы адсутнасьць адзінага кіраўніцтва з цэнтру. Напрыклад, Наркамзем у раён прысылае адны лічбы, Калгасцэнтр другія, Трактарацэнтр—трэція. Усе гэтыя лічбы знаходзяцца ў супярэчнасьці; невядома на што арыентавацца.

Прадстаўнік Калгасцэнтру, які прыяжджаў у раён на нараду старшынь калгасаў, вельмі быў здаволены, калі даведаўся, што ў Мсьціслаўлі будуецца МТС.

Трактарацэнтр да гэтага часу не дагаварыўся з **Лесбелам і Сэмпрамсаюзам** аб плянавым водпуску лесаматар'ялу і цэглы для МТС. Гэта вельмі перашкаджае будаўніцтву МТС. Кожная МТС сама хадайнічае, каб ёй адпусьцілі лесаматар'ял і цэглу. Дарма трацілца час, адцягваецца будаўніцтва. Усяго гэтага можна недапусьціць, калі сваячасова дагаварыцца аб водпуску будаўнічых матар'ялаў для МТС.

Расонская МТС да гэтага часу ня мае памяшканьня. Плян вучастку адведзены, але здымкі ня зроблены. Заключэньне дагавораў з калгасамі пачата толькі з 15 студзеня. Цэглы для будаўніцтва няма. З 37 тысяч рублёў акцый па заданьні, рэалізавана — толькі 27.215 руб. (73,5 проц. заданьня). Машын на МТС няма ніякіх. У кузьнях не хапае жалеза.

Разгорнута надрыхтоўка да будаўніцтва: закуплена 75 тысяч цэглы, завезена вапна, падрыхтаваны лесаматар'ял.

МТС будзе абслугоўваць два раёны: Жыткавіцкі і Тураўскі.

Тонеская МТС арганізавана з 15 кастрычніка з двух трактарных калён Ёсьць 70 трактараў. З гэтае колькасьці 31 трактар не патрабуе рамонту, 10 знаходзяцца ў капітальным рамонце, 13 патрабуюць капітальнага рамонту і 16 —дробнага рэмонту. Да трактараў не хапае запасных частак.

Кадры рулявых рыхтуюцца ў вячэрніх школах.

У зьвязку з дагаворнай кампаніяй наглядаецца прыліў у калгасы бедняко ў і сераднякоў.

МТС будзе абслугоўваць частку Чырвона-Слабодзкага і частку Слуцкага раёну. У Чырвонай Слабадзе акцый рэалізавана на 12 тысяч рублёў, у Слуцку—на 37 тысяч рублёў.

Можна-б было спыніцца на іншых МТС, але для нас і так зразумела становішча, у якім знаходзіцца арганізацыя машына-трактарных станцый і падрыхтоўка іх да другой бальшавіцкай вясны. Чарговымі, якія патрабуюць безадкладнага вырашэньня для МТС, зьяўляюцца наступныя задачы:

Шырока разгарнуць дагаворную кампанію; увязаць гэтую кампанію з барацьбой за новыя сотні і тысячы калгасьнікаў, за арганізацыю новых калгасаў; неабходна дамагацца стварэньня суцэльнае тэрыторыі, на якой будзе працаваць МТС.

Безадкладна прыняць усе захады да рэалізацыі акцый Трактарацэнтру, бо калі ня будуць сваячасова, у вызначаныя тэрмін, рэалізаваны акцыі, гэтым самым затармозіцца пабудова МТС, калёны трактараў выйдуць са спазьненьнем на поле.

Па ўдарнаму паставіць справу рамонту трактарнага парку і сельска-гаспадарчых машын. Да канца лютага МТС павінны быць поўнасьцю падрыхтаваны да сяўбы.

Максымум сур'ёзнай увагі аддаць падрыхтоўцы кадраў трактарыстаў, рулявых, мэханікаў. Мясцовыя раённыя арганізацыі, і ў першую чаргу Наркамасьветы, павінны павярнуцца тварам да падрыхтоўкі кадраў для МТС.

Усю работу МТС падначаліць барацьбе за суцэльную калёктывізацыю і ліквідацыю на гэтай аснове кулацтва, як клясы. МТС—рычаг суцэльнае калектывізацыі, а таму кожны калгасамі непачата, акцыі не рэалізаваны. У кузьні не хапае жалеза. Няма жылога памяшканьня.

З кадрамі рулявых параўнаўча добра: 60 чалавек ёсьць і 50 вучыцца.

Разгорнута надрыхтоўка да будаўніцтва: закуплена 75 тысяч цэглы, завезена вапна, падрыхтаваны лесаматар'ял.

МТС будзе абслугоўваць два раёны: Жыткавіцкі і Тураўскі.

Тонеская МТС арганізавана з 15 кастрычніка з двух трактарных калён Ёсьць 70 трактараў. З гэтае колькасьці 31 трактар не патрабуе рамонту, 10 знаходзяцца ў капітальным рамонце, 13 патрабуюць капітальнага рамонту і 16 —дробнага рэмонту. Да трактараў не хапае запасных частак.

Кадры рулявых рыхтуюцца ў вячэрніх школах.

У зьвязку з дагаворнай кампаніяй наглядаецца прыліў у калгасы бедняко ў і сераднякоў.

МТС будзе абслугоўваць частку Чырвона-Слабодзкага і частку Слуцкага раёну. У Чырвонай Слабадзе акцый рэалізавана на 12 тысяч рублёў, у Слуцку—на 37 тысяч рублёў.

Можна-б было спыніцца на іншых МТС, але для нас і так зразумела становішча, у якім знаходзіцца арганізацыя машына-трактарных станцый і падрыхтоўка іх да другой бальшавіцкай вясны. Чарговымі, якія патрабуюць безадкладнага вырашэньня для МТС, зьяўляюцца наступныя задачы:

Шырока разгарнуць дагаворную кампанію; увязаць гэтую кампанію з барацьбой за новыя сотні і тысячы калгасьнікаў, за арганізацыю новых калгасаў; неабходна дамагацца стварэньня суцэльнае тэрыторыі, на якой будзе працаваць МТС.

Безадкладна прыняць усе захады да рэалізацыі акцый Трактарацэнтру, бо калі ня будуць сваячасова, у вызначаныя тэрмін, рэалізаваны акцыі, гэтым самым затармозіцца пабудова МТС, калёны трактараў выйдуць са спазьненьнем на поле.

Па ўдарнаму паставіць справу рамонту трактарнага парку і сельска-гаспадарчых машын. Да канца лютага МТС павінны быць поўнасьцю падрыхтаваны да сяўбы.

Максымум сур'ёзнай увагі аддаць падрыхтоўцы кадраў трактарыстаў, рулявых, мэханікаў. Мясцовыя раённыя арганізацыі, і ў першую чаргу Наркамасьветы, павінны павярнуцца тварам да падрыхтоўкі кадраў для МТС.

Усю работу МТС падначаліць барацьбе за суцэльную калёктывізацыю і ліквідацыю на гэтай аснове кулацтва, як клясы. МТС—рычаг суцэльнае калектывізацыі, а таму кожны

Абавязуемся пашырыць пасеўную плошчу

Калгас «Чырвоны Кастрычнік» Пухавіцкага р-ну пабаявому распачаў падрыхтоўку да веснавой пасеўкампаніі. Складзены ўдарныя брыгады. Плян вясновай сяўбы абгаворан на сходзе калгасьнікаў.

Засыпка насенных фондаў пачата; ачыстка насеньня—ў самым разгары. Правяраецца сельска-гаспадарчы інвэнтар і ажыцьцяўляецца рамантуецца.

Калгас узяў на сябе абавязак пашырыць пасеўны плян. Улічана рабочая і цягавая сіла.

Л. Ц.

Ударная брыгада піянэраў дапамагае рыхтавацца да вясны

Вучні Дукорскай сямігодкі імя «16 партызан», Сьмілавіцкага раёну, дапамагаюць саўгасу Дукора ў падрыхтоўцы да веснавой пасеўкампаніі.

У сямігодцы складзена ўдарная брыгада з піянэраў і камсамольцаў у ліку 130 чалавек, якая ўзяла на сябе абавязак ачысьціць усё насеньне ў саўгасе Дукора і бліжэйшых калгасах Дукорскага сельсавету. Да работы ўжо прыступілі.

Кожны дзень з брыгады вылучаецца па 10 брыгадзіраў, якія пасьля заняткаў у школе ідуць ачышчаць насеньне. Работа праходзіць па ўдарнаму.

Лявіцкі.

Разгортваем дагаворную кампанію

Цяпер МТС заключаюць умовы з калгасамі. У гэтых умовах абумаўляецца, што абавязваюцца арабіць МТС калгасам і што дадуць калгасы МТС.

Шклоўская МТС гэтую вялікую кампанію таксама разгарнула. Надаўна на прэзыдыўме РВК была заслухана справаздача загадчыка МТС аб умовах з калгасамі. На прэзыдыўме пастанавілі мабілізаваць 15 асоб раённых працаўнікоў для заключэньня ўмоў з калгасамі. Вылучаныя працаўнікі выехалі на раён.

Г. Шумілаў.

Шклоўскі р.

Упарта рыхтуюцца да сяўбы

Па Клімавіцкім раёне ў час асеньняй пасеўкампаніі арганізавана шмат новых калгасаў. Новы калгас «Расьсьвет», Пуцімельскага с-с, зараз пабальшавіцку працуе і заклікае да сябе новых калгасьнікаў. У калгасе ўжо абагулена цягавая сіла, малочна-прадукцыйная жывёла і машыны. Зараз адбываецца ўдарная падрыхтоўка да бальшавіцкай вясны.

Клімавіцкі.

Рыхтуюцца не па-бальшавіцку

Па Крываносаўскім сельсавеце да веснавой кампаніі не рыхтуюцца. Яшчэ не пачалі чысьціць насеньня; трыеры стаяць не адрамантаванымі; працаўнікі сельсавету і КСУ спадзяюцца на самацёк.

У калгасе «Бальшавік» яшчэ не абмалочана насеньне і ўсё сельгаспадарчыя машыны стаяць не адрамантаванымі. Ні па вёсках, ні па калгасах ня зьбіраецца попел.

Стара-Дарожскі раён. Саланец А.

Не арганізавалі збор попелу

Попел, сабраны летась Аршанскай чыгуначнай школай ФЗС, загінуў, бо ня было паказана, куды накіраваць. Школа зварочалася да Райколгассаюзу, але адказу не атрымала.

Сёлета таксама ніякіх зьвестак, куды здаваць попел, няма. Між тым школа, пры наяўнасьці 1326 вучняў, магла-б даць вялікую колькасьць попелу для ўгнаеньня.

Хв. Шпак.

Бюракраты зрываюць будаўніцтва

У Вульскім раёне будуецца больніца, школы, чытальні і т. д.

І як сьмешна гучыць тэлеграма Нар камаховы здароўя: «Вам адпушчана 50 куб. мэтраў лесаматар'ялу. Куды адпрузіць».

Бюракраты!—вось што можна адказаць на гэта. Лесу-ж у Вулі шмат і яго для будаўніцтва больніц патрэбна каля 3.000 куб. мэтраў, а яны даюць 50 і зьбіраюцца адкульсьці прывезьці.

Прасілі ў лік нараду 300-500 к. м., дык дырэктар Полацкага Леспрамгасу Паўлоўскі адказаў: «Не такое вялікае ў вас будаўніцтва, пачакаеце»

А мы чакаць ні можам, хочам сваячасова пачаць працу, каб сваячасова яе і скончыць.

А. М—кі.

дагавор, кажная рэалізаваная акцыя —гэта цэгліна ў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Трэба рашуча весьці барацьбу з апартуністычнай недаацэнкай МТС. Трэба на бальшавіцку будаваць МТС—анорныя пункты суцэльнай калектывізацыі.

Р.

Па-бальшавіцку змагацца

ЗА аздараўленьне і рэканструкцыю ТРАНСПАРТУ

„Транспарт становіцца адным з самых вузкіх месц у нашай народнай гаспадарцы... Мы павінны ў гэтым годзе налегчы, каб сапраўды наш транспарт узьняць"

(З дакладу т. Кагановіча на партактыве маскоўскай арганізацыі ЎсеКП(б).

Зьнішчыць хібы і недахопы ў рабоце транспарту

Разгорнутае сацыялістычнае будаўніцтва, пераможны наступ на капіталістычныя элементы на ўсім фронце, рост прамысловасьці, значнае павялічэньне валавой продукцыі, вялікі ўздым сельска-гаспадарчай вытворчасьці, усё гэта ў 1931 рашаючым годзе пяцігодкі высоўвае перад транспартам новыя вялікія задачы. У трэцім рашаючым годзе пяцігодкі грузазварот чыгункі значна павялічваецца і павінен перавысіць грузазварот 1930 г. на 100 мільёнаў тон.

Яшчэ на XVI зьезьдзе ЎсеКП(б) тав. Сталін у сваім дакладзе гаварыў: **«Няма неабходнасьці шмат гаварыць аб вялізарным значэньні транспарту для ўсяе народнае гаспадаркі. І ня толькі для народнае гаспадаркі. Як вядома транспарт мае вельмі сур'ёзнае значэньне і для абароны краіны. І вось, ня гледзячы на вялізарнае значэньне транспарту, гаспадарка транспарту, рэканструкцыя гэтай гаспадаркі ўсё яшчэ адстае ад агульнага тэмпу развіцьця. Ці трэба яшчэ даводзіць, што пры такім становішчы мы рызыкуем абярнуць транспарт ў «вузкае» месца народнай гаспадаркі, якое можа затармозіць наша прасоўваньне наперад. Ці ня час пакласьці канец такому становішчу?».**

Факты сьведчаць аб тым, што партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі не зразумелі дырэктыў і пастаноў партыі, а працягваюць працу на «старыцы».

Ударны квартал на чыгуначным транспарце БССР неабходнага пералому ў рабоце ня даў. Тыя даныя, якія мы сёньня друкуем па асноўных чыгуначных вузлох БССР сьведчаць аб тым, што ня толькі не наступіла палепшэньне на асноўных паказальніках і плянавых заданьнях, але па радзе паказальнікаў маем нават далейшае пагоршаньне. Вось некаторыя галоўнейшыя паказальнікі, якія характарызуюць работу асноўных чыгуначных вузлоў. За апошні час значна павялічыўся процант хворых паравозаў, пагоршылася якасьць іх рамонту, адчуваецца вялікі недахоп запасных частак. У адным толькі Гомельскім чыгуначным вузьле процант папсаваных цягнікоў у ліпені месяцы складаў 9,93 проц., у жніўні 10 проц., у верасьні было 11,12 проц., у кастрычніку 9,32 проц. і лістападзе 9,1 проц. Ня выканана заданьне і па плянава папераджальным рамонце, па сярэднясутачным прабегу цягнікоў. Гэтае недавыкананьне заданьня мае тэндэнцыю росту, аб чым сьведчаць выпадкі паўторнага рамонту цягнікоў, якіх за адзін месяц было на Гомельскім чыгуначным вучастку 179. Гаспадарчыя, партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі чыгункі ў сваёй працтычнай дзейнасьці недаацанілі палітычнае значэньне змаганьня за здаровы паравоз.

Рацыяналізатарскія мерапрыемствы не праводзяцца ў жыцьцё з патрэбнай хуткасьцю, гарачая прамыўка паравозаў, якая амаль у два разы скарачае прастоі паравозаў у дэпо праводзіцца не рэгулярна (Менск).

Мы маем і факты злачыннай надбайнасьці на чыгуначным транспарце. Вось, напрыклад, падрыхтоўка транспарту да асеньня-зімовых перавозак на Магілёўскай станцыі. Прарабу быў даздзен загад канструяваньня чыгуначных ліній, але прараб замест таго, каб прыступіць да работы, каля трох месяцаў затрымліваў ход працы і гэтым самым сарваў пабудову лініі, а калі надышлі перавозкі і працягуліся цягнікі, дык іх ня было куды прымаць, бо і тыя пуці, якія меліся каля стэнцыі былі разабраны.

Дрэнна эксплёатуецца і рухавы састаў. Прыкладам можа служыць тое, што Ворша накіравала на ст. Магілёў цягнік у колькасьці сто парожніх вагонаў. Гэты цягнік загарадзіў шляхі станцыі Магілёў, а Жлобін адправіў на ст. Магілёў адразу 15 цягнікоў; у той час Ворша не дала паравозаў каб іх забраць. Такім чынам у Магілёве зьбіралася шмат цягнікоў, якія заграмаджалі станцыённыя лініі і стварылі пагражаючае становішча асеньня-зімовым перавозкам.

На паасобных вучастках чыгуначнага транспарту адсутнічае неабходны запас вугалю і дроў, а гаспадарчыя арганізацыі замест таго, каб эканоміць апал, адносяцца па галавацяпску. На Гомельскім чыгуначным вузьле 10 студзеня пад сьнегавы цягнік падалі паравоз, гэты паравоз бяз усякага руху пад парай прастаяў ад 8 да 12 гадз. дню, а 12 гадз. паступіла распараджэньне накіраваць цягнік у дэпо, а адтуль запналі ў тупік, дзе ён таксама прастаяў бяз усякага руху да 2 гадз. дню.

Асноўныя дырэктывы аб рабоце транспарту і задачах у сувязі з асьнья-зімовымі перавозкамі (якія даны ЦК УсеКП(б) 10 верасьня) ня выканаены і выконваюцца зусім алаба. Перабоі, якія мы мелі ў пэрыяд узмоцненых загатовак і перавозак сельска-гаспадарчых тавараў, перабоі, якія мы маем сёньня па лесазагатоўках ня гледзячы натое, што чыгуначны транспарт БССР далёка не нагружаны зрываюцца. Гэта сьведчыць аб тым што партыйныя арганізацыі не мабілізавалі рабочых транспартнікаў на ліквідацыю тых буйных недахопаў і прарываў, якія ёсьць на транспарце.

Арганізацыя сацспаборніцтва і ўдарніцтва на транспарце зьяўляецца слабым месцам. На тым жа Гомельскім чыгуначным вузьле з 3619 рабочых і служачых ударнікаў 2260 чал., у Менскім чыгуначным вузьле спаборніцтвам і ўдарніцтвам ахоплена 56,7 проц. усяго складу рабочых вузла. Гэта тлумачыцца тым, што з боку партыйных і прафэсыянальных арганізацый няма належнага кіраўніцтва ўдарніцтвам. Выкананьне сацдагавораў, якія заключаны ніжім не правяраецца.

Працоўная дысцыпліна на транспарце слабая. Наглядаецца нават упадак і ня толькі сярод беспартыйных, але і членаў партыі. Ёсьць факты самавольнага кіданьня работы членамі партыі, прыход на работу ў п'яным відзе (намесьнік начальніка 61 акалодку, Гомель). Ёсьць шмат самавольных адлучак, прагулаў бяз уважлівых прычын, адмаўленьня ад працы, невыкананьне норм выпрацоўкі. На адным толькі Аршанскім вузьле за кастрычнік месяц за розныя парушэньні працдысцыпліны было накладзена 160 спагнаньняў, 51 звальненьне з працы. На Менскім вузьле пытаньне з працдысцыплінай абстаіць яшчэ горш, калі ў кастрычніку было вынесена 56 спагнаньняў, дык у сьнежні гэта лічба ўзрасла да 95. Гэта зьяўляецца абуражучым фактам сыстэматычнага парушэньня працдысцыпліны. Вучастковыя камітэты партыі і ячэйкі слаба кіруюць мясцкомамі і замест жывога кіраўніцтва, інструктажу, пасылаюць сухія абежнікі, якія нізавымі ячэйкамі наўрад ці чытаюцца.

Трэба цьвёрда запамятаць, што задачы, якія стаяць перад транспартам, могуць быць вырашаны толькі тады, калі сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва будуць выкарыстаны з максымальнай паўнатой.

Гіганцкі аб'ём работы ў трэцім годзе пяцігодкі, які прыводзіць нас да завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі, будзе годам рэканструкцыі транспарту, дарэннага выпраўленьня ўсіх недахопаў, якія маюцца ў яго рабоце.

Трывожныя сыгналы

з Гомельскага чыгуначнага вузла

На Гомельскім чыгуначным вузьле наглядаюцца вялікія злоўжываньні. Адміністрацыя вузла, замест таго, каб ашчадна адносіцца да апалу, сваім галавацяпствам нерацыянальна разбазарвае яго.

10 студзеня быў паданы паравоз пад сьнегавы цягнік на станцыю Гомель—сартовачны Заходняй чыгункі, дзе ён прастаяў пад цягніком бяз усякага руху ад 8 да 12 гадз. А 12 гадзіне паступіў загад накіраваць паравоз у Дэпо, але калі паравоз прыбыў на ст. Гомель—гаспадарчы, дык яго загналі ў тупік, дзе ён прастаяў таксама бяз руху да 14 гадз. і ўвесь гэты час паравоз дарэмна апальваўся.

Такое-ж агіднае зьявішча наглядаецца і з разьмеркаваньнем брыгад у Жлобіне.

11 студзеня з Жлобіну ў Гомель быў накіраваны гомельскі паравоз Ш-2155 з брыгадай і рэзэрвам.

Калі паравоз прыбыў на ст. Салтанаўка, дык яго абганяў цягнік № 80. Каб дарэмна не стаяць машыніст прапанаваў С. П., каб той адправіў паравоз па няправільнай калёіне.

С. П. пачаў узгадняць гэта пытаньне з дыспэтчарам, але апошні нічога ня ведаў, што гэта за паравоз.

Паравоз рэзэрвам быў адпраўлен са Жлобіна ў 12 гадз. 32 хв., у той час калі адпачынак брыгадзе скончыўся ў 5 гадз. 45 хв. Між тым у 8 гадз. 15 хв. са Жлобіна ў Гомель быў адпраўлен цягнік № 628, са жлобінскім паравозам і жлобінскай брыгадай. Трэба думаць, што назад у Жлобін паравоз з брыгадай будзе накіраваны таксама рэзэрвам.

Да чаго даводзяць вось гэткія выпадкі?

У той час, калі эканомна трэба выдаткаваць апал, паравозы дарэмна прастойваюць у тупіках і па 88 кілёмэтраў прабягаюць рэзэрвам.

Брыгадам плацяць грошы за тое, што яны нічога ня робяць. Каму гэта патрэбна, калі ня шкодніцкам, перашкаджаючым нашаму сацыялістычнаму будаўніцтву.

Неабходна раз і назаўсёды навучыць некаторых супрацоўнікаў чыгункі як трэба скарыстоўваць рабочую сілу, апал і паравозы.

Брыгада.

На Аршанскім вузьле працоўная дысцыпліна падае

Працоўная дысцыпліна на Аршанскім вузьле МБВ не паляпшаецца, а нават пагоршваецца. Самавольныя адлучкі, прагулы, прыход на работу ў нецьвярозым відзе, невыкананьне норм выпрацоўкі, надбайныя адносіны да сваіх абавязкаў—усё гэта яшчэ панусе сярод некаторай часткі рабочых Аршанскага вузла.

Надбайнасьць да работы таксама мае тут месца.

Машыніст Латышоў прышоўшы прымаць цягнік, адкрыў сыфон, а сам пашоў у памяшканьне запісаць рамонт. Забесьпячальныя клапаны працавалі каля двух гадзін дарма.

Пад цягнік № 857 падаюць паравоз, а ў гэтым паравозе, толькі вышаўшым з рамонту, не працуе тормаз вэстынгаўза.

Ставяць у рамонт паравоз № 9664, у якім патрэбна зьлітаваць падшыпнік. Замест гэтага яго ў дэпо толькі наліваюць бабітам. Лопнуўшы падшыпнік і паравоз зноў ставіцца ў рамонт.

РЭАГАВАНЬНЕ НА РАБСЕЛЬКОРАЎСКІЯ ЗАМЕТКІ Ў ДРУКУ—

моцны сродак у выкананьні дырэктыў партыі па пытаньню крытыкі і самакрытыкі

Аб выніках усебеларускага рабселькораўскага рэйду па рэагаваньні на заметкі ў друку

ПАСТАНОВА ПРЭЗЫДЫУМУ ЦКК КП(б)Б АД 11-XII—30 г.

I.

Праведзеная ЦКК разам з рэдакцыяй газ. «Зьвязда» праверка рэагаваньня на крытыку ў друку з шырокім прыцягненьнем рабселькораў (па 58 раёнах—260 праверачных брыгад—800 ч.) паказвае, што пастанова прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б ад 15 студзеня 1929 году аб узмацненьні рэагаваньня на крытыку ў друку ў значнай меры спрыяла мабілізацыі КП(б)Б шырокіх рабочых і працоўных мас на больш рашучае разгортваньне пралетарскай самакрытыкі і ўзьняцьця не дзейнасьці.

Рашаючыя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва дасягнуты на падставе наўхільнага ажыцьцяўленьня лёзунгу бальшавіцкай самакрытыкі, якая накіравана супроць апартуністычных скажэньняў лініі партыі, супроць бюракратызму, цяганіны і коснасьці, што мела і мае месца ў паасобных зьвяньнях савецкага, каапэрацыйнага, прафэсыянальнага і гаспадарчага апаратаў.

Рабселькоры пад кіраўніцтвам партыі сваёй творчай ініцыятывай занялі вельмі значнае месца, як актыўныя дапаможнікі партыі ў сацыялістычным будаўніцтве. Буйны рост палітычнай актыўнасьці рабочае клясы і шырокіх працоўных мас меў вялікі ўплыў на рост рабселькораўскіх радоў, рост нашага партыйнага і савецкага друку, асабліва нізавога, які практычна дапамагае партыі і рабочай клясе ў ажыцьцяўленьні асноўнага лёзунгу па выкананьні пяцігодкі за чатыры гады.

II.

На аснове вынікаў праверкі прэзыдыум ЦКК КП(б)Б адзначае, што на радзе зьвеньняў партыйнага, прафэсыянальнага, савецкага і гаспадарчага апаратаў і масавых арганізацый самакрытыка разгорнута яшчэ далёка недастатковальна, асабліва ў рэагаваньні на крытыку ў друку.

Ня гледзячы на рад катэгарычных дырэктыў аб узмацненьні рэагаваньня на крытыку ў друку, да гэтага часу мае месца:

а) у радзе раёнаў і арганізацый (Кой данава, Чашнікі, Лагойск, чыгуначныя, каапэрацыйныя арганізацыі і інш.) назіраецца яўнае ігнараваньне рабселькораўскіх заметак, што тармозіць далейшае разгортваньне пралетарскай самакрытыкі і ў паасобных мясцох прывяло нават да распаду раду насьценных газэт і аслабленьня рабселькораўскай работы;

б) па радзе раёнаў і фабрычна-заводзкіх прадпрыемстваў (Віцебск, Бабруйск, Ворша, Шклоў) дапускаецца цяганіна і надзвычайная затрыжка (да 2-х год) з расьсьледваньнем заметак, незадавальняючая якасьць адказаў на заметкі, у шматлікіх выпадках замест канкрэтных адказаў даюцца бюракратычныя «абвяржэньні». У гэтым віна ваты нават і кіруючыя работнікі некаторых раёнаў (Лагойск, Узда, Смаргонь і інш.);

в) органы пракуратуры ў радзе раёнаў (Гомель, Бабруйск, Глуск, Чэрвень і інш.) недавальняюча змагаюцца за дзейнасьць рабселькораўскіх заметак, дапускаюць цяганіну ў расьсьледваньні заметак па справах, у якіх нават ёсьць просты заціск самакрытыкі і гаменьне на карэспандэнтаў;

г) засталася амаль невыкананай пастанова прэзыдыуму ЦКК ад 15-I 29 году ў часьці перабудовы і паляпшэньня работы бюро расьсьледваньня цэнтральных і, асабліва, нізавых шматтыражак і насьценных газэт. Пры большасьці газэт адсутнічаюць бюро дасягненьняў. Бюро расьсьледваньняў пры газэтах бяз усякай сыстэмы абмяжоўваюцца механічнай перасылкай заметак на расьсьледваньне, большасьць якіх пападае не ў першапачатковыя інстанцыі (ФЗМК, ячэйкі), а ў цэнтральныя і раённыя ўстановы, асабліва ў органы КК-РСІ, загружаючы і ператвараючы іх у нейкую перадатачную інстанцыю, што тармозіць хуткае расьсьледваньне заметак і ствае цяганіну.

Ёсьць рад фактаў, калі з боку рэдак цый газэт, асабліва з боку рэдакцый «Беларускай вёскі» пасылаюцца ў ЦКК- НК РСІ на расьсьледваньне такія заметкі, якія ніякай грамадзкай каштоўнасьці ня маюць і зьмест іх часамі не правяраецца ў рэдакцыях;

д) рад КК-РСІ на мясцох яшчэ ня сталі на чале змаганьня за дзейнасьць заметак, не паставілі сыстэматычнай работы па наладжваньні праверкі рэагаваньня і ў паасобных выпадках самі дапускалі зацяжку ў расьсьледваньні (Аршанская КК), абмяжоўваючыся часамі фармальнай пастановай па гэтых пытаньнях, ня прыцягваючы канкрэтных асоб, вінаватых у ігнараваньні крытыкі ў друку, да суровай адказнасьці (Віцебская КК).

Адзначыць, што пастанова прэзыдыуму ЦКК ад 15 студзеня 1929 г. па пытаньні аб узмацненьні рэагаваньня на крытыку ў друку ў значнай сваёй частцы ня выканана. Усе гэтыя факты нерэагаваньня і яўнага ігнараваньня крытыкі ў друку тармозяць далейшае разгортваньне бальшавіцкай самакрытыкі і фактычна спрыяюць бюракратычным і клясава-варожым элемэнтам, якія ёсьць у паасобных зьвеньнях савецкага апарату, у іх змаганьні супроць самакрытыкі, што прэзыдыум ЦКК распэньвае, як праяўленьне правага апартунізму на практыцы.

III.

Выходзячы з гэтага, ЦКК пастанаўляе:

1. Катэгарычна папярэдзіць партыйныя, прафэсыянальныя, савецкія, гаспадарчыя і інш. арганізацыі аб недапушчальнасьці такіх адносін да рэагаваньня на крытыку ў друку. Прапанаваць усім партыйным, прафэсыянальным і іншым арганізацыям забясьпечыць рашучы пералом у справе паляпшэньня рэагаваньня на крытыку ў друку.

а) ускласьці адказнасьць на кіраўнікоў устаноў, прадпрыемстваў за рэагаваньне на крытыку як у цэнтральным, так і мясцовым друку, устанавіўшы наступную сыстэму рэагаваньня;

б) завесьці спэцыяльны ўлік рабселькораўскіх заметак, даручаючы ў кожным асобным выпадку расьсьледваньне тэй ці іншай заметкі аднаму з супрацоўнікаў, даючы па сутнасьці заметкі канкрэтны адказ, прыняўшы тэрміновыя захады па зьнішчэньні паказаных у заметцы недахопаў.

2. У мэтах устанаўленьня сыстэмы рэагаваньня, скарачэньня перадатачных інстанцый лічыць неабходным:

а) па заметках, якія патрабуюць прыняцьця мер у адміністрацыйным парадку, даваць адказ на працягу 5 дзён з моманту зьмяшчэньня яе ў друку або атрыманьня ад рэдакцыі ў непадрукаваным выглядзе;

б) па заметках, якія патрабуюць расьсьледваньня на мясцох, даваць больш хуткія адказы, у крайнім выпадку ня больш, як у дэкадны тэрмін;

в) прапанаваць рэдакцыям цэнтральных, гарадзкіх, раённых, шматтыражных і насьценных газэт дасылаць на расьсьледваньне заметкі непасрэдна тэй партыйнай, прафэсыянальнай, савецкай і інш. арганізацыі, якая больш за ўсё зьвязана з пытаньнямі, закранутымі ў заметцы;

г) у больш важных выпадках па заметках, якія маюць грамадзкае значэньне, практыкаваць перасылку заметак для рэагаваньня ў органы КК-РСІ і жывое расьсьледваньне самой рэдакцыяй, для чаго неабходна палепшыць падбор штату бюро расьсьледваньняў пры газэтах працаздольнымі работнікамі;

д) раіць рэдакцыям газэт шырока прыцягваць да расьсьледваньня і праверкі рэагаваньня на заметкі рабселькораў і насьценкораў.

3. Прапанаваць гарадзкім і раённым КК-РСІ забясьпечыць хуткае рэагаваньне і адказ рэдакцыям па заметках, усклаўшы адказнасьць на аднаго з працаўнікоў апарату КК—за штодзённую праверку ўсіх цэнтральных і мясцовых газэт і пастаноўку рэагаваньня, не чакаючы пасылкі матар'ялу ад рэдакцыі; КК-РСІ неабходна павесьці рашучую барацьбу з праяўленьнямі бюракратычных адносін да пралетарскай самакрытыкі, не пакідаючы ні аднаго факту злоснага нерэагаваньня на рабселькораўскія заметкі без суровага пакараньня вінаватых асоб у гэтым.

4. Даручыць КК-РСІ сумесна з рэдакцыямі газэт, з шырокім прыцягненьнем рабселькораў, сэкцый РСІ пры саветах — праводзіць сыстэматычную праверку рэагаваньня на заметкі ў друку; пэрыядычна праводзіць нараду рабселькораў і гаспадарнікаў, дзе побач з іншымі дакладамі заслухоўваць даклады аб дзейнасьці крытыкі ў друку, паасобныя даклады бюро расьсьледваньняў пры рэдакцыях газэт аб становішчы рэагаваньня.

5. Прапанаваць пракурору рэспублікі ў тэрміновым парадку правесьці расьсьледваньне па матар'ялах рабселькораўскага рэйду на працягу 2-х мес., прыцягнуць да судовай адказнасьці асоб, вінаватых у сыстэматычным нерэагаваньні і злосным ігнараваньні рабселькораўскіх заметак. Паставіць узорную работу па рэагаваньні на крытыку ў друку з боку апарату пракуратуры.

6. Прыняць да вадама, што радам мясцовых КК-РСІ па выніках рэйду прыцягнуць да адказнасьці паасобныя кіраўнікі прадпрыемстваў, устаноў і парткалектываў, якія дапусьцілі ігнараваньне і нерэагаваньне на крытыку ў друку.

Даручыць парткалегіі ЦКК у месячны тэрмін разгледзець справы членаў партыі, вінаватых у нерэагаваньні і ігнараваньні крытыкі ў друку, прыцягнуўшы іх да партадказнасьці.

7. Улічваючы, што рабселькораўскі рэйд па праверцы рэагаваньня на заметкі ня ўсюды праведзен, даручыць КК-РСІ, якія не правялі гэтага рэйду правесьці яго на працягу студзеня месяца.

8. Гэту пастанову апублікаваць у друку; даручыць рэдакцыям газэт шырока асьвятляць матар'ялы рэйду ў друку, прапрацаваўшы гэту пастанову на калектывах рэдакцый, на масавых зьлётах рабкораў як у гарадох, так і раёнах.

Нам. старшыні ЦКК КП(б)Б і наркома РСІ Бел. РЫСЬКІН.

З лістоў рабселькораў

Лютаўская пачатковая школа (Чарэйскі раён) зьяўляецца ўдарнай па распаўсюджваньні сярод насельніцтва газэт. Кожны вучань школы выпісвае газэту і зьбірае падпіску сярод сялянства. Ц.

Настаўнікі Падгайцаўскага сельсавету (Шклоўскі раён) не забясьпечваюцца прадуктамі па рабочай норме. Так мясцовая каапэрацыя «выконвае» дырэктывы партыі і ўраду.

Селькор Я.

НАЗНАЧЭНЬНЕ т. КАРАВІНА А. П. НАЧАЛЬНІКАМ КІРАЎНІЦТВА МІЛІЦЫІ І КРЫМІНАЛЬНАГА ВЫШУКУ ПРЫ СНК БССР. Па свайму сацыяльнаму паходжаньню т. Каравін А. П. зьяўляецца рабочым. Да рэвалюцыі працаваў дрэваапрацоўшчыкам і каменшчыкам.

У лістападзе 1917 г. т. Каравін А. П. уступіў у партызанскі атрад, які вёў барацьбу з немцамі—акупантамі. Акупанты т. Каравіна захапілі ў палон і кінулі ў Новазыбкаўскую турму, дзе ён прысядзеў 9½ месяцаў. У час знаходжаньня ў турме—т. Каравін не парываў сувязі з Чырвонай арміяй. 24 сьнежня 1918 г. т. Каравін Унечаскай базай ЧК вызваляецца з турмы і ў гэты-ж дзень назначаецца Намесьнікам Старшыні ЧК у аслабонёнай мясцовасьці ад акупантаў—немцаў.

У 1919 г., калі ўспыхнула Стракапытаўскае паўстаньне, т. Каравін з сваёй невялікай кольксасцю байцоў прымае самы актыўны ўдзел у барацьбе з гэтым паўстаньнем і з боем, першым, займае г. Гомель, дзе і застаецца працаваць у органах ЧК.

Тав. Каравін у органах ЧК—ДПУ працаваў больш 12 год. Увесь час выбіраўся ў розныя партыйныя організацыі і савецкія ўстановы.

У сучасны момант т. Каравін А. П. зьяўляецца кандыдатам у члены ЦК КП(б)Б.

Пастанова СНК БССР за 16 студзеня 1931 г. т. Каравін назначан Начальнікам Кіраўніцтва Міліцыі і Крымінальнага Вышуку пры СНК БССР.

Па БССР

⊙ **Вясеньняя пасеўкампанія,** якая праводзіцца ў гэтым годзе пад знакам выкананьня дырэктыў сьнежаньскага пленуму ЦК УсесКП(б), павінна знайсьці адбітак у рабоце кажнай бібліятэкі, для чаго неабходна:

Азнаёміць праз кнігу рабочых чытачоў з чарговымі задачамі калектывізацыі сельскай гаспадаркі, з задачамі вясеньняй сяўбы і разьвіцьця жывёла гадоўлі, як канчатковага вырашэньня мясной праблемы. Асабістую ўвагу неабходна зьвярнуць на забясьпячэньне літаратурай рабочых брыгад, якія накіроўваюцца на вёску па падрыхтоўцы да вясеньняй сяўбы, забясьпечыўшы кожную брыгаду як агульнапалітычнай літаратурай, якая знаёміць з чарговымі задачамі партыі на вёсцы, так і агратэхнічнай літаратурай.

У кожнай бібліятэцы неабходна наладзіць сталую выстаўку літаратуры да весняной сяўбы.

⊙ **ЦСПСБ прапанаваў Гомельскаму** Гарпрафсавету вызначыць 15 брыгадзіраў, Мазырскаму 10 брыгадзіраў, Бабруйскаму—14, Барысаўскаму — 11 брыгадзіраў для пасіленьня загатовак насеньня.

ЗАКОНЫ І ПАСТАНОВЫ ЎРАДУ БССР

Пастанова

Савету Народных Камісараў БССР

ПРА МЯСЦОВЫЯ СТРАХАВЫЯ НАСЕННЫЯ ФОНДЫ.

Для забясьпечаньня сельскай гаспадаркі насеньнем у выпадках недароду альбо стыхійных бед СНК БССР пастанўляе:

1. Прызнаць мэтазгодным стварэньне на дабравольных падставах у кожным калгасе і паселішчы страхавых насенных фондаў.

2. Страхавыя насенныя фонды ўтвараюцца па пастанове агульных сходаў калгасьнікаў у калгасах і бядняцка-серадняцкай масы насельніцтва ў вёсках і іншых паселішчах праз засыпку насеньня з аграмаджанага ўраджаю папярэдняга году у калгасах і ўносаў паёў натураю ў вёсках і іншых паселішчах.

Насеньне павінна быць да засыпкі добра ачышчана і па якасьці задавальняць усім патрабаваньням да насеньня.

3. Утварэньне страхавых насенных фондаў пачынаецца ў бягучым годзе і штогод папаўняецца роўнымі часткамі з тым, каб у 1933 г. разьмер іх быў даведзен у кожным калгасе і паселішчы да 30 проц. усяго патрэбнага насеньня для пасеву 1933 г. па пасобных культурах (жыта, пшаніца, авёс, ячмень, грэчка, лён і бабовыя).

Засыпка яравых культур павінна быць зроблена штогод да 1 лютага, а зімовых—да 10 жніўня.

Насеньне страхавога фонду павінна пэрыядычна аднаўляцца.

4. Пастановы агульных сходаў (арт. 2) аб раскладзе страхавога насеннага фонду і аб тэрмінах яго ўнясеньня павінны зацьвярджацца сельскім саветам і зьяўляюцца абавязковымі для ўсіх грамадзян.

Пры раскладзе улічваецца заможнасьць кожнай гаспадаркі, прычым незаможным гаспадаркам даюцца нізкія стаўкі з дапушчэньнем растэрміноўкі на працягу 3-х год. а кулацка-заможныя уносяць пай адразу ў разьмерах 100 проц. патрэбнага для іх палёў насеньня.

5. Насеньне страхавога фонду выдаецца як зваротная бяспроцантная тэрміновая пазычка па пастанове агульнага сходу, зацьверджанай сельскім саветам. Пры чым у першую чаргу пазычка выдаецца бядняцкім гаспадаркам.

Нязвернутыя ў тэрмін пазычкі, а таксама ня ўнесеныя паі на стварэньне насенных фондаў спаганяюцца ў такім самым парадку, як і самаабкладаньне.

6. Страхавы фонд можа быць скарыстаны толькі па пастанове агульнага сходу (арт. 2), зацьверджанай сельскім саветам, і толькі на мэты, для якіх ён створан.

Скарыстаньне страхавога насеннага фонду на іншыя мэты забараняецца.

7. У выключных выпадках па пастанове сельскага савету ў межах сельскага савету, а па пастанове раённага выканаўчага камітэту ў межах раёну можа рабіцца перакідка насеннага фонду з аднаго калгасу і паселішча ў другое з устанаўленьнем абавязка вярнуць пазычку з першага ўраджаю.

8. Арганізацыйная дапамога стварэньню насенных страхавых фондаў ускладаецца на сельскія саветы і адведзеныя калгасна-каапэрацыйныя арганізацыі, а агульнае кіраваньне і нагляд—на раённыя выканаўчыя камітэты.

9. Захаваньне і выдача страхавых фондаў па пастанове агульных сходаў (арт. 5) у паселішчах, неаб'яднаных у першапачатковыя таварыствы, праводзіцца сялянскімі таварыствамі ўзаемадапамогі; яны павінны весьці асобны дапамогі; яны павінны весьці асобны падлік фонду па кожным паселішчы і па асобных культурах.

10. Выдаткі, зьвязаныя з захаваньнем страхавых насенных фондаў, будаўніцтвам і рамонтам сьвірнаў і іншыя гаспадарчыя выдаткі па страхавых насенных фондах у паселішчах, неабъединаных у першапачатковыя таварыствы, пакрываюцца сельскімі саветамі за лік сродкаў самага насельніцтва, якія арганізуюцца ў форме самаабкладаньня.

11. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты, сельскія саветы і калгасна-каапэрацыйныя арганізацыі неадкладна пачаць стварэньне насенных фондаў, згуртаваць вакол гэтага мерапрыемства ўвагу калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкага насельніцтва.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**
Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР **М. Калевіч.**

28 студзеня 1931 г.
г. Менск.

Пастанова

Савету Нар. Камісараў БССР

пра зьмену пастановы пра арыентовачнае размеркаваньне раёнаў па асноўных галінах сельскай гаспадаркі.

Для зьмены пастановы СНК БССР за 20 верасьня 1930 г. «Пра арыентовачнае размеркаваньне раёнаў па асноўных галінах сельскай гаспадаркі» (З. З. БССР 1930 г., № 36, пазт. 237), Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

Надаць Кармянскаму, Краснапольскаму, Крупскаму, Любаньскаму, Чаўускаму і Хоцімскаму раёнам лёнакапрадзільнага кірунак.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**
Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР **М. Калевіч.**

18 студзеня 1931 г. г. Менск.

Пастанова

Савету Нар. Камісараў БССР

пра выкананьне пастаноў ураду аб вытворчасьці абсталяваньня для сталовак і фабрык-кухняў.

Эканамічная Нарада БССР адзначае, што пастанова за 18 ліпеня 1930 г. «Пра выраб абсталяваньня для сталовак і фабрык-кухняў» ня выканана.

На 1 студзеня 1931 г. зроблена ўсяго 35 хлебарэзак і 40 катлоў. Выраблена бульбамыйак, бульбачыстак, бульбарэзак, мясарубак, карнарэзак, кіпяцільнікаў і тэрмасаў зусім не пачаты.

ВСНГ ня зварочваў належнай увагі на выкананьне паказанай пастановы Эканамічнае Нарады, а праграма абсталяваньня ня была разьмяркована па кварталах.

Бяручы пад увагу паказанае вышэй, Эканамічная Нарада БССР пастанаўляе:

1. Абвясьціць Белмэталаб'яднаньню вымову за невыкананьне паказанай пастановы Эканамічнае Нарады і абвязаць ВСНГ прыцягнуць да судовай адказнасьці асоб, вінаватых у зрыве даручэньня аб вырабе абсталяваньня для сталовак і фабрык-кухняў.

2. Прапанаваць ВСНГ разам з Белкаапсаюзам разгледзець праграму Белмэталаб'яднаньня аб павялічаным вырабе ў 1931 г. абсталяваньня для сталовак і фабрык-кухняў і ўжыць захады для забясьпечаньня выкананьня яе.

3. Выслухаць праз дзьве дэкады на пасяджэньні Эканамічнае Нарады інфармацыю ВСНГ аб выкананьні гэтае пастановы.

Старшыня Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР **М. Галадзед.**
Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР **М. Калевіч.**

18 студзеня 1931 г. г. Менск.

Пастанова

Савету Нар. Камісараў БССР

пра жыльлёвыя льготы для інжынэрна-тэхнічнага і адміністрацыйна-гаспадарчага пэрсаналу, які запрашаецца для работы на будаўніцтва Кузбаса.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

Пашырыць пастанову СНК БССР за 18 Кастрычніка 1930 г. «пра захаваньне права на жылую плошчу за інжынэрна-тэхнічным і адміністрацыйна-гаспадарчым пэрсаналам, які запрашаецца для работы на будаўніцтва магнітагорскага, кузнецкага і Пятроўскага (у Забайкальі) мэтаногрічных заводаў» (З. З. БССР 1930 г. № 38, пазт. 258) таксама на інжынэрна-тэхнічны і адміністрацыйна-гаспадарчы пэрсанал, які запрашаецца для работ на будаўніцтва Кузбаса.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**
Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР **М. Калевіч.**

24 Студзеня 1931 году.
г. Менск.

Пастанова Прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б

АБ ЗАГРУЗЦЫ ЦЭНТРАЛЬНЫМІ УСТАНОВАМІ І АРГАНІЗАЦЫЯМІ РАЕННЫХ ПАРТЫЙНЫХ ОРГАНАЎ (РАЙКОМАЎ, РАЙКІ) БЯЗ ВЕДАМА ЦК і ЦКК-НК РСІ.

1. Адзначыць, што, ня гледзячы на пастанову Прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б ад 1-XII 30 г., аб рашучай барацьбе з фактамі самастрахоўкі і непатрэбнай пасылкі шматлікіх копій, гэтыя факты прадаўжаюць яшчэ мець месца і ў апошні час.

2. Асабліва недапушчальнымі прызнаць ужываньні цэнтральнымі ўстановамі і арганізацыямі мэтады расьсылкі абежнікаў, або паасобных даручэньняў. раённым кіруючым арганізацыям (РК КП(б)Б, РКК-РСІ), замест таго, каб гэтыя даручэньні даваць непасрэдна падпарадкаванаму свайму органу ці асобе.

3. Забараніць усім цэнтральным установам і арганізацыям пасылаць абежнікі і даручэньні Райкомам і РКК-РСІ без папярэдняга ўзгадненьня з ЦК і ЦКК-НКРСІ.

Прасіць усе Райкомы і РКК-РСІ аб усіх выпадках парушэньняў гэтай дырэктывы паведамляць ЦКК-НКРСІ.

4. Паказаць тав. Амбражуласу (Лясбел), Масюкову (НКЗем), Пятровічу (Белсельсаб) на недапусьцімасьць рассылкі абежнікаў РКК-РСІ з прапановай «РКК-РСІ праверыць выкананьне прадпісаньняў абежнікам прапаноў» без папярэдняга ўзгадненьня з ЦКК-НКРСІ.

5. Пастанову апублікаваць у друку.

Нам. старшыні ЦКК КП(б) Бел. РЫСЬКІН.

АПАВЯШЧЭНЬНІ

Культпроп ЦК КП(б)Б склікае 31 студзеня а 11 гадз. раніцы (пакой 14) нараду па пытаньню пастаноўкі партвучобы па радыё. На нараду выклікаюцца наступныя т. т. Садоўскі, Масевіч, Науменак, (Белрадыёцэнтр), Макоўскі (Камвуз), Васілевіч (Усебеларуская сайпартшкола), Пятушкоў (Менскі Гарком КП(б)Б), Баброў (Гомельскі Гарком ПК(б)Б) і Пракапчук (Сэкцыя Навуковых працаўнікоў).

У пятніцу 30 студзеня ў 11 гадзін дню ў бібкалектары адбудзецца пасяджэньне бібліяграфічнай групы па разборы яўрэйскай літаратуры.

Запрашаюцца бібліятэкары, пісьменнікі, настаўнікі і ўсе жадаючыя.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ТЭАТР-КІНО

З ПАНЯДЗЕЛКА 26 СТУДЗЕНЯ

„Чырвоная Зорка“	Лепшы фільм сэзону „РУБІКОН“ Драма ў 7 часткак. Пачатак а 7 г. Каса а 5 гадзін.
Кіно-тэатр „Культура“	Кіно- повесьць „ВЕЦЕР З ПАРОГАЎ“ Звыш праграмы: вялікі канцэрт. Юморыст Кемп р. Танц Жанглеры.)-(2 ЖЭРВЕ 2 Пачатак а 7 гадз. Каса ад 5 гадз.
Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“	Мастацкі фільм „ЧАЛАВЕК З РЭСТАРАНУ“. Звыш праграмы: Наш укл. д у пяціго ку. В творчасьці Белдзяржкіно. Пачатак а 6. Каса а 4 з пал. гадз.
Кіно „ПРАЛЕТАРЫЯ“	Амэрыканскі фільм „НАЧНЫ КРЫК“ Пачатак а 6 гадзіне. Каса ад 4 з паловай гадз.
Дзяцячы кіно-тэатр ЮНЫ ПІЯНЭР	Гісарычны фільм „ДВА БРАНЯВІКІ“ ў 6-ай частках Пачатак а 4-й гадзіне Каса з 12.

ДРУГІ БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.

30 і 31 студзеня апошні АДКРЫТЫ ПАКАЗ

„ПЕРШАЯ КОННАЯ“

50 паказаў „Першая Конная“

Білеты ў касе тэатру з 29 студзеня ад 12—2—і 5 вечара.

У рабочай касе з 12—2—і ад 4—6 вечара.

Да гэтага часу працягваюць паступаць да аплаты квіты і іншыя дакуманты б. вучасткаў Лесбелу.

Для хутчэйшага высьвятленьня

поўнай запазычанасьці па б. Лесбелу і яе

хутчэйшага ліквідаваньня,

— наступным абвяшчаецца —

што ўсе паказаныя квіты і інш. дакуманты сяляне павінны падаваць да аплаты ў бліжэйшыя нашы вучлеспрамгасы да 20-II—г. г.

Прад'яўленыя пасьля 20-II—г. г. дакуманты прымацца да аплаты ня будуць.

Рагачоўскі Леспрамгас.

АД БЕЛАРУСКАЙ АКАДЭМІІ НАВУК

23 студзеня г. г. адбылося пасяджэньне акадэмічнага савету БАН. Савет, разам з іншымі пытаньнямі, пастанавіў правесьці да 20 лютага г. г. дадатковыя выбары акадэмікаў, надаўшы гэтым выбарам шырокі грамадзкі характар. У выкананьні пастановы Акадэмічнага Савету, прэзыдыум Беларускай Акадэміі Навук **абвяшчае вольныя пасады акадэмікаў** па наступных навукова-дасьледчых інстытутах і катэдрах Акадэміі:

1. Інстытут гісторыі . . 1.
2. Інстытут мовазнаўства . 1.
3. Інстытут паводзін чалавека 1.
4. Інстытут хэміі . . . 1.
5. Катэдра марксызму-ленінізму 1.
6. Катэдра агранамічных навук 1.
7. Катэдра матэматыкі . . 1.
8. Катэдра эканомгеаграфіі . 1.
9. Катэдра фізыкі . . . 1.
10. Катэдра этнаграфіі . . 1.
11. Яўрэйскі сэктар . . 1.
12. Польскі сэктар . . . 1.

З одна II разьдзелу § 18 і 19 статуту БАН: „у пагадзейныя члены Беларускай Акадэміі Навук выбіраюцца па мастаўніцкі навукі або мастацтва, якія узбагацілі навуку або мастацтва працамі асабліва выдатнага значэньня... кандыдатуры ў праваадзённ члены Беларускай Акадэміі Навук вылучаюцца навуковымі ўстановамі і вышэйшымі школамі, культурнымі і грамадзкімі арганізацыямі, адцавелнымі народнымі камісарыятамі, а таксама паасобнымі вучонымі і іх групамі“.

Прэзыдыум БАН, выходзячы з вышэйпадаванага загаду выбараў акадэмікаў і маючы адпаведную пастанову Акадэмічнага Савету, просіць усе грамадзкія і навуковыя ўстановы і арганізацыі ВНУ і паасобных вучоных зараз-жа прыступіць да абгаворваньня і высоўваньня адпаведных кандыдатаў у акадэмікі і ўсе сьпісы на высунутых кандыдатаў у акадэмікі з адпаведнымі матар'ялы і харак арыстыкамі накіроўваць у „Канцылярыю БАН па правядзеньні дадатковых выбараў акадэмікаў“.

Прэзыдыум БАН

БЕЛАРУСКАЕ КІРАЎНІЦТВА СУВЯЗІ,

на падставе абежніку Наркампаштэлю ад 28-30 лістапада 1930 году № 4-521,

АБВЯШЧАЕ,

што камітэтам стандартызацыі пры СПА УСТАНОЎЛЕНЫ СТАНДАРТНЫЯ РАЗЬМЕРЫ ПАПЕРЫ ДЛЯ ПІСЕМ І ПАШТОВЫХ КАРТАК,

чаму прыём пісьмовых адпраўленьняў нестандартных разьмераў, таксама на паняросна паперы, ня ўложаных у канверт, з дня 1 лютага 1931 году ня будзе вытворацца ўсімі прадпрыемствамі БССР.

Стандартныя разьмеры канвэрту 229 × 162 і 162 × 114 м-м. карткі 148 × 105 м-м. на шчыльнай паперы.

Мінімальныя разьмеры пісем і бандэролляў з друкаванымі творамі і друкаванымі паперамі 114 × 81 м-м.

Пры рассылках розных абвестак раіцца карыстацца стандартнымі паштовымі карткамі.

Адпраўленьні, якія ня будуць адпавядаць гэтым разьмерам альбо здавацца ня ўложаныя ў канвэрты будуць зварочацца назад адправіцелям (установам і прыватным асобам).

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА

СЭКТАР КНІГАРАСПАЎСЮДЖВАНЬНЯ.

ДА 50-ГАДОВАГА ЮБІЛЕЮ тав. ВАРАШЫЛАВА

ВЫШЛІ З ДРУКУ:

АЛТАЙСКІ **ВАРАШЫЛАЎ (поэма)** Стар. 152. Цана 1 р. 10 к.

ВАРАШЫЛАЎ **СТАЛІН І ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ** Стар. 44 Цана 10 к.

Прадаюцца ва ўсіх кнігарнях Белдзяржвыдавецтва, крамах спажыв. каапэрацыі.

НАРКАМПРАЦЫ БССР

прапануе ўсім кіраўнікам устаноў і прадпрыемстваў па БССР, у выкананьне пастановы НКП БССР аб звароце былых чыгуначнікаў на чыгунку, **ПАДАЦЬ СЬПІСЫ** ў мясцовыя кіраўніцтвы кадраў, а там, дзе іх няма райінспэктарам працы на ўсіх працуючых, паказаных у пастанове былых чыгуначнікаў, па наступнай форме:

Прозьвішча, імя і па бацьку	Партыйнасьць.	Нашы нальгасьць	Якія навуч. установы скончыў і калі	Якую мае профэс. ня чыгунач.	Колькі ён працаваў у ей	Калі ён пакінуў працу на чыгунку	Калі і адкуль прыйшоў на ўстанову, дзе ён працуе зараз і на якой пасадзе

Мясцовыя кіраўніцтвы кадраў, а там, дзе іх няма, райінспэктары працы падаюць Наркампрацы БССР сьпісы па вышэйпаказанай форме з дадаткам аднэй графы, куды накіраван для працы на чыгунку і на якую работу.

Нам. Наркампрацы БССР ЗАХАРАВА

— ПА ЎСІХ ПЫТАНЬНЯХ, —

ЗЬВЯЗАНЫХ З ПАЕЗДКАМІ НА КУРОРТ,

арганізацыі і адзіночкі павінны зварочвацца

ДА БЕЛАРУСКАГА КУРОРТБЮРО

(г. Менск), якое абслугоўвае ўсе гарады і раёны БССР).

Запытаньні, накіраваныя Цэнтральнаму Кур. Бюро у Маскву, апошнім не разглядаюцца і накіроўваюцца у Менск.

Белар Курбюро.

Народны суд Старобінскага раёну, на падставе прысуду ад 5-га сьнежня 1930 г., па арт. 196 з санкцыяй 213 арт. КК абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр. Залатарэвіч Аляксандру Платонаву, настаўніку Чыжавіцкай школы за тое, што будучы старшынёй рэв. камісіі, ён на працягу 10 месяцаў не рабіў рэвізіі, ня гледзячы на найўнасьць у с.-с. грашовых злоўжываньняў.

Яўрэйскі нацсуд гор. Менску абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне члену арцелі «Чырвоны Лаечнік» Леўіну Ізраілю Якаўлеву, па 196 арт. Кр. Кад. за згубу з возу тавару на суму каля 30 руб., які належыць арцелі.

Нарсуд Старобінскага раёну па пастанове прысуду ад 10-га сьнежня 1930 году па 196 з санкцыяй 213 арт. Кр. Код. за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў, пацягнуўшы зьнішчэньне на плошчы 3-х га маладой пасадкі лесакультуры на 50 проц., абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне лясьніку Лістападоўскага Леспрамгасу Федаркову Андрэю Трахімавічу.

Нарсуд Ліцьнянскага раёну, згодна прысудам ад 19-га студзеня б. г. абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр. Бондараву, Васілю Восіпаву, студэнту Горацкага Зоатэхнічнага Інстытуту па 196 арт. К. К. за нядбайныя адносіны да сваіх службовых абавязкаў у часе веснавой пасеўнай кампаніі мінулага году.

Галоўлітбел 598 ДРУКАРНЯ БДВ імя тав. СТАЛІНА